Нумар № 62 (4467) Беларусі

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў КП(б)Б

ВЕРАСЕНЬ 25 1932 г. № 215 (4467) Год выданьня XVI

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

Вялікаму майстру пралетарскага мастацтва, рэвалюцыйнаму барацьбіту за справу вызваленьня працоўнага чалавецтва ўсяго сьвету, ударніку сацыялістычнай будоўлі — Максіму Горкаму бальшавіцкае прывітаньне!

ПАСТАНОВА СНК САЮЗУ ССР І ЦК УсеКП(б)

РАД МЯСЦОВЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ ЗВАРАЧАЕЦЦА ДА СНК І ЦК АБ ПРАДАСТАЎЛЕНЬНІ НАСЕННАЙ ПАЗЬКІ ДЛЯ САЎГАСАЎ І КАЛГАСАЎ. З ПРЫЧЫНЫ ТАГО, ШТО УРАДЖАЙ ГЭТАГА ГОДУ ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА ЗДАВАЛЬНЯЮЧЫМ, А УРАДАМ УСТАНОЎЛЕНА ДЛЯ КАЛГАСАЎ ЗЬМЕНШАНЫ ПЛЯН ДЗЯРЖАЎНЫХ ЗБОЖЖАЗАГАТОВАК, ЯКІ ПАВІНЕН БЫЦЬ ВЫКАНАН ПОЎНАСЬЦЮ, СНК І ЦК ПАСТАНАЎЛЯЮЦЬ:

1. АДХІЛІЦЬ УСЕ ПРАПАНОВЫ АБ ВЫДАЧЫ НАСЕННАЙ ПАЗЬКІ.

2. ПАПЯРЭДЗІЦЬ, ШТО Ў БЯГУЧЫМ ГОДЗЕ НІ САЎГАСАМ, НІ КАЛГАСАМ НАСЕННАЯ ПАЗЬКА НЯ БУДЗЕ ВЫДАВАЦЦА НІ ДЛЯ АЗІМАЙ, НІ ДЛЯ ЯРАВОЙ СЯЎБЫ.

3. УСКЛАСЬЦІ НА СТАРШЫНЬ КАЛГАСАЎ І ДЫРЭКТАРОЎ САЎГАСАЎ АДКАЗВАЦЬ ЗА ВЫДЗЯЛЕНЬНЕ ПОЎНАСЬЦЮ НАСЕННЫХ ФОНДАЎ ДА ЯРАВОЙ СЯЎБЫ Ў ВЫЗНАЧАНЫЯ СНК І ЦК ТЭРМІНЫ (НЕ ПАЗЬНЕЙ 15 СТУДЗЕНЯ 1933 ГОДУ) І ЗА ІХ ПОЎНУЮ ЗАХАВАНАСЬЦЬ.

Старшыня СНК Саюзу ССР — В. МОЛАТАЎ (СКРАБІН).
Сакратар ЦК УсеКП(б) — І. СТАЛІН.

Аршанскі вузел трымае экзамэн перад краінай

Чыгуначны транспарт уступіў у самы адказны пэрыяд сваёй работы. Посьпехі разьвіцьця сацыялістычнай гаспадаркі абумовілі тэмп росту грузазвароту, якога ня ведае ні адна капіталістычная краіна. Там, у капіталістычных краінах, у выніку паглыбленьня эканамічнага крызісу штогод скарачаюцца разьмеры перавозак (ПАЗШ, Германія, Польшча і інш.), у нас, у краіне, будуючай сацыялізм, штогод разьмер перавозак усё ўзрастае, прычым у гэтым годзе яны павялічаюцца на 25 проц. супроць мінулага году.

Выкананьне пляну асеньня-зімовых перавозак патрабуе асабліва выразнай, баявой работы ўсіх зьвеньняў чыгуначнага транспарту. «Зьвязда» ня раз указвала, што рашаючае значэньне ў выкананьні пляну асеньня-зімовых мае **падрыхтоўка**, бальшавіцкая мабілізацыя мас на поўнае выкананьне ўсіх вымаральнікаў як па колькасных, так і па якасных паказальніках.

Аршанскі чыгуначны вузел мае рад бясспрэчных посьпехаў у падрыхтоўцы. Палепшылася становішча паравознага парку, ёсьць посьпехі і ў рабоце па рамонту пуці.

Праведзены конкурс па спэцыяльным раёнце паравозаў прайшоў з вялікім узьдымам. У ім прымала ўдзел 33 брыгады ў ліку 603 чалавек. Заданьне па спэфрамонту выканана датэрмінова (замест 34 паравозаў, адрамантавана 39). Дасягнута зьніжэньне процанту хворых паравозаў супроць устаноўленай нормы на 2,57. Палепшылася якасьць рамонту, у выніку чаго зьменшылася колькасьць паўторных рамонтаў (з 24 да 3). Такавы практычныя вынікі конкурснай работы чырвонасьцяжнага дэпо Воршы.

Найбольш выдатнымі змагарамі за здаровы паравоз зьяўляюцца брыгады т. т. **Батурэнкі, Жукава, Філімонава, Каржыцкага, Лупчынскага і Шэўчанкі**, а за здаровы вагон брыгада тав. **Васілевкі** (рамонтны пункт). Вярхоўнства гэтых брыгад дасягнута дзякуючы рэалізацыі 6 ўмоў тав. Сталіна, правільнай арганізацыі працы, сацыялістычнаму спаборніцтву і ўдарніцтву. Пераход брыгад па рамонту паравозаў на гаспадарчы разьлік, ужываньне зьменна-сустрэчнага планавання і вялікую эфэктыўнасьць у рабоце. Поўнае выкананьне вытворчага заданьня, гэтыя брыгады дасягнулі эканоміі ў выдаткаваньні сродкаў ад 15 да 30 проц.

Колькасьць хворых паравозаў за першую дэкаду верасьня даведзена да 12,97 проц. пры заданьні ў 15,95 проц. Барацьба за здаровы паравоз забясьпечыла выкананьне вымаральнікаў па камэрцыйнай хуткасьці цягнікоў.

Аднак, гэтыя **посьпехі не даюць ніякага права гаспадарнікам, партыйнай і прафсаюзнай арганізацыі вузла аслабіць увагу да далейшай барацьбы за здаровы паравоз.** Трэба сказаць, што ў справе замацаваньня спаранай — асноўнай умовы ўздыму паравознага парку ў апошні час ёсьць буйныя зрывы. Калі да гэтага дадаць, што ўстаноўленая норма сярэднясутачнага прабегу таварнага паравоза ня выконваецца (замест 216 клм. прабег паравозаў складае толькі 209), дык стане зразумелым, што ўвага паравознай гаспадарцы ня можа ні ў якай меры быць аслаблена.

Поўная ліквідацыя абязьлічкі, барацьба з кожным асобным выпадкам зрыву спаранай, прычым барацьба самая настойлівая, узьнятая на адпаведную прынцыповую вышыню, яшчэ большае павышэньне тэмпаў і якасьці рамонту паравозаў — баявая задача арганізацый вузла.

Посьпех выкананьня пляну асеньня-зімовых перавозак у гэтым годзе вырашае ваточная гаспадарка. Між тым, увага да яе па Аршанскім вузле невыстарчальная. Абменны пункт працуе дрэнна. Абязьлічка ў рамонце і доглядзе яшчэ жыве. Да апошняга часу пастанова ЦК КП(б)Б ад 4 ліпеня аб былучэньні ваточнай гаспадаркі з агульнадэпоўскай не выканана. Канкрэтная праграма аздараўленьня ваточнага парку, якая вызначана ў загадзе тав. Андрэева, не рэалізавана. У выніку — ваточная гаспадарка зьяўляецца самым вузкім месцам на вузле. Якасьць рамонту нізкая. Паўторнасьць — частае зьявішча.

Асноўная ўвага гаспадарнікаў, партыйнай і прафсаюзнай арганізацый вузла, усіх чыгуначнікаў павінна быць зьвернута на **поўнае аздараўленьне ваточнага парку, на** [illegible] важнейшага вучастку транспарту. Не дасьцігнуты ад «аб актыўныя» прычыны, а сапраўды па-бальшавіцку мабілізаваць усе ўнутраныя сродкі і магчымасьці.

Дысцыпліна — важнейшая ўмова выразнай работы транспарту, выкананьня пляну перавозак. На Аршанскім вузле з дысцыплінай справа стаіць ня досыць добра. Па казальнікам гэтага зьяўляецца рост здарэньняў, прагулаў і г. д. Вакол пытаньняў барацьбы за жалезную дысцыпліну не разгорнута адпаведная работа.

Ва ўсёй сыстэме падрыхтоўчай работы да асеньня-зімовых перавозак важнае значэньне мае **падрыхтоўка складачных памяшканьняў і арганізацыя пагрузачна-разгрузачных работ.** Гэта пытаньне, як відаць, выпала з поля зроку кіраўніцтва вузла. Складачныя памяшканьні не падрыхтаваны. Прастой паравозаў пад пагрузкай і выгрузкай значна перавышае норму. Нават на складзе апалу ёсьць рад няспраўнасьцяй. Няспраўныя ваганэткі, кручкі і інш. Гэта прыводзіць да таго, што прастой паравозаў пад наборам апалу таксама вышэй нормы.

Бальшавіцкая барацьба за бесьперабойную работу транспарту магчыма толькі на аснове поўнай рэалізацыі **6-ці ўмоў т. Сталіна.** На жаль, адна з важнейшых умоў — далейшае паляпшэньне матар'яльна - бытавога становішча рабочых не заняла [illegible] арганізацый вузла.

Гэта можна праілюстраваць на некалькіх фактах. Асаблівую вострасьць на Аршанскім вузле набывае жыльлёвае пытаньне. Завяршэньнем разгорнутага жыльлёвага будаўніцтва і свячасовым рамонтам гэта вострасьць у значнай меры была-б зьнішчана. Між тым сканчэньне будаўніцтва ўпіраецца, як тлумачаць гаспадарнікі, у недахоп цьвікоў і шкла. Прычым характэрна, што толькі зараз гэтыя цьвікі і шкло сталі прадметам абмеркаваньня гаспадарнікаў. Раней яны аб гэтым не клапаціліся.

У адносінах забесьпячэньня рабочых спэцвопраткай на зіму кіраўніцтва ТСТ не праявіла ніякай ініцыятывы. Нельга абыйсьці бязьдзейнасьці ў гэтым гаспадарнікаў і прафарганізацый. Яны ня ставілі гэта пытаньне перад ТСТ, спасылаючыся на дапамагаюць у рабоце ТСТ, не растлумачылі рабочым поўнае палажэньне аб спэцвопратцы.

Поўная рэалізацыя 6-ці ўмоў тав. Сталіна, правільная расстаноўка партыйных сіл, паляпшэньне партыйна - масавай работы, бальшавіцкая барацьба за паляпшэньне матар'яльна-бытавога становішча рабочых — у гэтым ключ да вырашэньня задач, пастаўленых у сувязі з асеньня - зімовымі перавозкамі.

Аршанскі вузел адзін з буйнейшых. Ён зьвязвае БССР з асноўнымі пралетарскімі цэнтрамі Саюзу. Работа вузла, як часткі ўсяго транспарту, непасрэдна зьвязана з пытаньнем свячасовага забесьпячэньня нашага грандыёзнага будаўніцтва будматар'ялам, нашых фабрык і заводаў сырцом, рабочых пралетарскіх цэнтраў прадуктамі харчаваньня. Гэта кладзе на чыгуначныя арганізацыі, па кожнага камуніста транспарту вялікую адказнасьць. Задача заключаецца ў тым, каб ні на адну гадзіну не затрымліваць грузаў у часе асеньня-зімовых перавозак, каб вузел працаваў выразна, паўдарнаму.

У сувязі з лістом ленінградзкіх і сьвердлоўскіх рабочых на Аршанскім вузле пачынаецца творчы ўздым сярод рабочых, разгортваецца барацьба за бальшавіцкую сустрэчу XV гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі. Створаная брыгада паравоза СУ-9872 імя «Зьвязды» на чале з машыністамі **Славуцічам і Аляксеевым**, якая ў 2-м усесаюзным конкурсе спараных брыгад атрымала грамату лепшай у СССР, узяла на сябе рад канкрэтных абавязацельстваў да 15 гадавіны і выклікала ўсіх паравозьнікаў БССР.

Аршанскі вузел мае ўсе ўмовы быць у перадавых радах барацьбітоў за пасьпяховае выкананьне пляну асеньня-зімовых перавозак.

Раённае парткіраўніцтва і чыгуначныя арганізацыі вузла павінны кіраваць не «з габінэту», а аператыўна, канкрэтна, пераносячы цэнтр **цяжару ў нізавое зьвяно.**

Ва ўсім гэтым вузлу павінен дапамагчы РК КП(б)Б. Пастанова партыі аб сыстэматычнай дапамозе тэрытарыяльных партыйных арганізацый транспарту павінна асабліва даць рэальныя вынікі ў часе асеньня-зімовых перавозак.

Вузел трымае экзамэн перад краінай. Пад кіраўніцтвам партыйнай арганізацыі Аршанскія чыгуначнікі павінны змагацца, каб гэты экзамэн з гонарам вытрымаць.

Максіму Горкаму бальшавіцкае прывітаньне

Словы Горкага зразумелыя блізкія масам

У дзень 40-годзьдзя вашай слаўнай літаратурна-мастацкай рэвалюцыйнай дзейнасьці, прэзыдыум Камуністычнай Акадэміі вітае ў вашай асобе вялізарнага пралетарскага пісьменьніка, творчасьць якога стала часткай агульна-пралетарскай справы. У вашай творчасьці знайшла яркае адлюстраваньне рэвалюцыйная барацьба рабочае клясы, вашы такія глыбокія, такія зразумелыя і блізкія рабочай клясе літаратурна-мастацкія вобразы прасякнуты моцнай баявой энэргіяй, выклікаюць нянавісьць да эксплёататараў, абуджаюць рэвалюцыйную актыўнасьць рабочых і працоўных мас, натхняюць гэтыя масы па нястомную барацьбу з клясавым ворагам за пралетарскую рэвалюцыю, за сацыялізм.

Вашы сакрушальныя ўдары па фронце сусьветнай буржуазіі, падпальшчыкаў вайны, інтэрвэнцыі, ваша нястомная барацьба за вызваленьне працоўных з пад крыгнёту эксплёатацыі, робяць імя Горкага сваім, зразумелым і блізкім мільёнам працоўных усяго сьвету. Прэзыдыум вітае вас, як барацьбіта за культурную рэвалюцыю, натхніцеля, арганізатара савецкай літаратуры і пастаўніка шырокай масы пралетарскіх, калгасных пісьменьнікаў.

Няхай жыве наш Горкі — вялікі пралетарскі пісьменьнік!

Няхай жыве барацьба за камунізм!

Прэзыдыум Камакадэміі.

Вялікі мастак цьвёрда ідзе з пралетарыятам

Усе працоўныя гераічнай краіны Саветаў, будуючыя сацыялізм, адзначаюць вялікае радаснае сьвята — 40-годовы юбілей літаратурна-мастацкай дзейнасьці Горкага — першага вялікага пралетарскага пісьменьніка, буйнейшага арганізатара пралетарскага літаратурнага руху, перадавога барацьбіта за справу рабочае клясы. Сёньня Максіма Горкага вітаюць мільёны пралетараў усяго сьвету, якія нястомна вядуць барацьбу з капіталізмам, барацьбу, у якой моцна, бадзёра гучаць баявыя заклікі Аляксея Максімавіча. Максіма Горкага вітаюць лепшыя прадстаўнікі сусьветнай навукі, мастацтва, якія сталі паводле яго закліку і прыкладу па бок пралетарыяту, што змагаецца за сваё вызваленьне, за новае сьветлае жыцьцё бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва.

Максіму Горкаму шлюць сваё палкае прывітаньне маладыя рабочыя, пісьменьнікі, рабкоры, ваенкоры і сялькоры, якія вырасьлі і растуць з дапамогай чулага пастаўніка.

Сёньня краіна сацыялізму, краіна вялізарных дасягненьняў і посьпехаў, можа гаварыцца сваёй мастацкай літаратурай, сьвяткаваць [illegible] перамогу, прадсказаную Горкім, Сёньня кіраўніцтвам, упушчам Аляксей Максімавіч забясьпечвае згуртаваньне ўсіх савецкіх пісьменьнікаў навакол ленінскай партыі, навакол задач перабудовы мастацкай літаратуры. Сваім мужным словам Аляксей Максімавіч указвае лепшым людзям інтэлігенцыі капіталістычных краін выхад з капіталістычнай пераваты, просты шлях барацьбы ў радох пралетарыяту. Таму ўся грамадзкая мастацкая дзейнасьць Аляксея Максімавіча выклікала і выклікае нянавісьць, злосьць і выцьцё ў стаю клясавых ворагаў пралетарыяту. Вялікі мастак цьвёрда ідзе з пралетарам, заслужана карыстаецца павагай і любоўю працоўных мас Савецкага саюзу, усяго сьвету.

Разам з усімі працоўнымі аргкамітэт Саюзу Савецкіх Пісьменьнікаў СССР і РСФСР шле дарагому Аляксею Максімавічу, свайму пачэснаму старшыні, гарачае прывітаньне і спадзяецца, што вялікі пралетарскі мастак будзе яшчэ многа год пад сьцягам ленінскай партыі змагацца супроць усіх філістараў, «мохапічных грамадзян», супроць бруднага сьвету прыгнечаньня і эксплёатацыі, за сацыялістычную культуру, за пабудову бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва.

Аргкамітэт Саюзу Пісьменьнікаў СССР і РСФСР



Т. Т. СТАЛІН І М. ГОРКІ. КАСТРЫЧНІК 1931 ГОДУ.

Буравесьніку сусьветнай пралетарскай рэвалюцыі!

Дарагі Аляксей Максімавіч!

У дзень слаўнага юбілею тваёй літаратурнай і грамадзкай дзейнасьці, пасылаем табе — нашаму вялікаму пралетарскаму пісьменьніку, наша братэрскае шчырае прывітаньне.

Тваё высока-мастацкае слова, твая мужная грамадзкая дзейнасьць супроць сусьветных ворагаў пралетарскай дзяржавы, твая нястомная работа на ўсіх франтох сацыялістычнага будаўніцтва, у тым ліку і ў пабудове і далейшым росьце пралетарскай культуры, — усё гэта зьяўляецца найлепшым прыкладам для нас, пісьменьнікаў Савецкай Беларусі.

Цябе, буравесьніка пралетарскай рэвалюцыі ў мінулым і буравесьніка сусьветнай пралетарскай рэвалюцыі ў нашыя дні, мы гонарам лічым сваім найлепшым пастаўнікам, найлепшым узорам таго, як трэба спачаць высокую годнасьць пралетарскага пісьменьніка, з годнасьцю грамадзяніна краіны Саветаў, з годнасьцю барацьбіта за бясклясавае сацыялістычнае грамадзтва.

Няхай-жа і надалей тваё кожнае слова будзе баявым бальшавіцкім запарадам супроць аджываючага капіталістычнага сьвету! Няхай і надалей тваё сьветлае імя будзе сьцягам лепшага перадавога ў радох змагароў за сацыялізм, за сусьветную пралетарскую рэвалюцыю!

Аргкамітэт Саюзу Савецкіх Пісьменьнікаў БССР.

УБОРКУ БУЛЬБЫ СПАЛУЧАЦЬ З УДАРНЫМ ЗАВЯРШЭНЬНЕМ СЯЎБЫ

СВАЯЧАСОВА ЎБРАЦЬ І ЗАХАВАЦЬ

На 20 верасьня па БССР выкапана бульбы 89.611 га (14,7 проц.). Прырост за апошнюю пяцідзёўку складае ўсяго толькі 46.371 га (7,6 проц.). Пры такіх чарапашых тэмпах капаньне бульбы можна зацягнуць да 10 лістапада. Апошні-ж тэрмін сканчэньня ўборкі, зацьверджаны калегіяй НКЗБ, 1—5 кастрычніка.

Выкананьне пляну па зонах характарызуецца наступнымі паказальнікамі. Па паўночнай зоне плян выканан на 7 проц., цэнтральнай — на 10 проц., паўднёвай — 26,5 проц. Як відаць, асабліва адстаюць раёны паўночнай зоны. Рад раёнаў яшчэ фактычна не распачаў капаньня — Полацкі — 0,8 проц., Расонскі — 0,8 проц. і г. д.

Зацяжка з уборкай бульбы тармозіць стопроцантнае выкананьне пляну па сяўбе азімых. Справа ў тым, што значная частка азімых павінна засявацца па бульбянішчы. У некаторых раёнах на бульбянішчы трэба засеяць да 40 проц. азімых (Крычаўскі і інш.).

Сяўбу далей зацягваць нельга. Гэта вымагае ад партыйных арганізацый фарсаваць уборку бульбы з тым, каб неадкладна аслабяніць і падрыхтаваць плошчу пад азімыя. Асабліва гэта датычыць бульбяна-вывёлагадоўчых раёнаў, дзе пад бульбай занята каля 30 проц. усёй пахаці.

Посьпехі ўборкі будуць залежыць ад правільнай арганізацыі работ у калгасах, саўгасах і брыгадах. Якасьць работы, барацьба са стратамі павінны быць пастаўлены ў цэнтр увагі ў часе ўборкі. Ацэнку работы брыгад і кожнага калгасніка паасобку трэба праводзіць не па колькасьці ўбраных гэктараў, а па колькасьці і якасьці накапанай бульбы. Толькі пры такой сыстэме работы будзе захавана якасьць, бульба з зямлі будзе чыста выбірацца.

Побач з уборкай, бульбу трэба свячасова адсартаваць і захаваць. Аднак, факты сьведчаць аб тым, што ня ўсюды пытаньням захаваньня бульбы аддаецца належная ўвага. Кіраўнікі саўгасу **Строчыцы** (Капыльскага раёну) з-за непадрыхтаванасьці бульбахавальнікаў вымушаны былі накіраваць назад 20 фурманак калгасьнікаў і аднаасобнікаў, якія прывезьлі бульбу ў саўгас для здачы ў лік плянавых дзяржаўных загатовак. Такім злачынствам строчынскіх апартуністаў патурацць нельга.

Арганізаваўшы правільнае захаваньне бульбы ў капцох (у саўгасах і калгасах) трэба ўжыць усе захады, каб поўнасьцю захаваць тую частку бульбы, якая будзе перакінута ў гарады. Урокі мінулага году сьведчаць якраз аб тым, што тут больш за ўсё бульба псуецца і гніе.

Свячасова ўбраць і захаваць бульбу з 610.000 гэктараў — вось адна з адказьнейшых задач усёй КП(б)Б. Пры мабілізацыі шырокіх пластоў пралетарскай і калгаснай грамадзкасьці гэта задача будзе выканана поўнасьцю.

Падрыхтаваць бульбахавальнікі

ВОРША. (Наш кар.). Раён павінен убраць 18 тыс. гэкт. бульбы. Гэта амаль у два разы больш мінулага году. Але ход уборкі яўна нездавальняючы. На 20 верасьня выкапана толькі 1.757 га, або 9,6 проц. пляну.

Здавалася-б, што пры такім павялічаным пляне ўсе кіруючыя раённыя арганізацыі і калгасы павінны былі-б загадзя прыняць усе меры да таго, каб убраць бульбу, свячасова і без страт.

На самай-жа справе ўрокі мінулага году, калі былі дапушчаны значныя страты, ня ўлічаны. Рад саўгасаў і калгасаў нават пасклалі каляндарныя пляны, не стварылі і не прымацавалі брыгад да вучасткаў.

Толькі нязначная частка калгасаў і саўгасаў распрацавалі каляндарныя пляны ўборкі, склалі брыгады і прымацавалі іх да вучасткаў. Гэта мы маем у калгасе **«Шлях саветаў»**, Кудаеўскага сельсавету, які да 8 верасьня скончыў сяўбу азімых і пераключыўся на ўборку бульбы.

Прыклады ўмелай падрыхтоўкі да ўборкі бульбы паказаў саўгас «Бабінічы». Конка і звозка наводле пляну павінны быць правесены з 16 верасьня па 1 кастрычніка. Для ўборкі 50 га бульбы створаны тры брыгады. Да апошніх прымацаваны коні, бульбакапалкі і іншы дробны інвэнтар.

Саўгас «Якаўлевічы», наадварот, зусім не падрыхтован да ўборкі. Рабочай сілай ён не забясьпечан, каляндарнага пляну таксама няма. Дырэкцыя саўгасу разьлічае конку бульбы пачаць толькі з 25 верасьня. Такая апартуністычная зацяжка пагражае зрывам уборкі, звозкі і хаваньня бульбы.

Трэба адзначыць, што **пытаньнямі хаваньня бульбы яшчэ не занялася ні адна арганізацыя.** Прыгарадная гаспадарка ТСТ мае зусім невыстарчальную колькасьць хавальнікаў для бульбы.

Паўлсўскі.

Строчыцкія апартуністы сарвалі здачу бульбы дзяржаве

ВУЗДА. Уборка бульбы па калгасах Камянецкага сельсавету пачалася з 12 верасьня. Пляны ўборкі і нормы выпрацоўкі былі свячасова абгаворваны на агульных сходах калгасьнікаў і ў кожнай брыгадзе.

Прынятыя нормы — за выбарку адзінага цэнтнэра — 0,20 працадня сыстэматычна перавыконваюцца. Ударніцы калгасу **імя Сталіна Дубовік Аксіньня і Дубовік Надзя** нормы выпрацоўкі перавыконваюць кожны дзень па 20 проц.

Побач з уборкай калгасам і аднаасобнікамі быў арганізован абоз па здачы бульбы дзяржаве. Да [illegible] з [illegible] тав. Палойкін аб здачы бульбы ў саўгас «Строчыцы», Капыльскага раёну, 13 верасьня туды было накіравана 20 фурманак з бульбай.

Кіраўнікі-ж саўгасу Строчыцы замест таго, каб прыняць бульбу, сустрэлі калгасьнікаў такімі словамі: «што вы здурэлі, яшчэ рана здаваць бульбу, прывязеце праз месяц». Бульба ад калгасьнікаў апартуністамі калгасу «Строчыцы» прынята ня была. Калгасьнікі вымушаны былі, правёзшы бульбу 20 клм., вярнуцца назад. Мы патрабуем прыцягнуць да судовай адказнасьці вінаватых у зрыве прыёму бульбы ад калгасьнікаў і аднаасобнікаў.

А. Тарасевіч

Перадавікі ўборкі

Па паўночнай зоне

1) Горацкі — 24 проц.

Па цэнтральнай зоне

1) Быхаўскі — 47,4 проц.
2) Шклоўскі — 38,8 проц.

Па паўднёвай зоне

1) Пятрыкоўскі — 67,9 проц.
2) Парыцкі — 44,1 проц.
3) Чачэрскі — 43,7 проц.

Такеба адстаюць

Па паўночнай зоне

1) Полацкі — 0,8 проц.
2) Расонскі — 0,8 проц.
3) Дрысенскі — 2,1 проц.

Па цэнтральнай зоне

1) Пухавіцкі — 1,6 проц.
2) Талачынскі — 2,6 проц.
3) Смалявіцкі — 2,7 проц.

Па паўднёвай зоне

1) Лоеўскі — 3,9 проц.
2) Камарынскі — 4,3 проц.
3) Рэчыцкі — 6,1 проц.

Прыгарадныя гаспадаркі плятуцца ў хвасьце

Па сыстэме Белкаапсельгасаб'яднаньня трэба ўбраць 2.334 га бульбы. На 20 верасьня ўбрана 381 га (16,5 проц.). Гаспадаркі ЗІК плян уборкі выканалі на 11,5 проц., ПРК — на 13,2 проц.

Асабліва адстаюць прыгарадныя гаспадаркі Віцебшчыны. Саўгас **«Новы сьвет»** выкапаў 1 га (замест 40), **імя Молатава** — 2,7 проц. пляну, а **«Новы шлях»** зусім не распачынаў уборкі.

Не прыступілі таксама да ўборкі і гомельскія гаспадаркі ЗРК заводаў «Вазуві», «Камінтэрн», імя Ланцуцкага.

Намесьнік дырэктара Белкаапсельгасаб'яднаньня т. **Візнэр** адставаньне з уборкай бульбы тлумачыць адсутнасьцю рабочай сілы, дрэнным забесьпячэньнем рабочых і інш.

Калі дырэкцыя, па мэтаду Візнэра, будзе толькі абмяжоўвацца спускам пляну, а не арганізацыяй работ у прыгарадных гаспадарках, дык зразумела, што бульба зусім можа застацца на полі.

Праўда, кіраўнікі аб'яднаньня паслалі ў Віцебск трох чалавек для свячасовай арганізацыі ўборкі. Людзі атрымалі камандыровачныя грошы, выехалі на месца прызначэньня і спакойна сядзяць там, склаўшы рукі. А тымчасам рабочая сіла ў саўгасах не набіраецца, уборка праходзіць злачынна марудна.

Віцебскі гарком таксама не асабліва турбуецца, не мабілізуе масы на барацьбу з стратамі пры ўборцы бульбы.

Рад калгасаў пе скарыстоўвае бульбакапалак. Антымэханізатарскія настроі маюць месца ў саўгасах «Чырвоны маяк» (Менск), «Новы сьвет» (Віцебск), Старабарысаўскай фэрме.

Паміж уборкай і звозкай бульбы назіраецца сур'ёзны разрыў. У менскіх саўгасах «Вольная праца», «Чырвоны маяк», «Чырвоны транспартнік» на полі ў кучах ляжыць па 50-70 тон бульбы.

Пытаньнем арганізацыі транспарту і цягавай сілы не аддаецца належная ўвага. Белплодагароднінна павінна ў першую чаргу падумаць як свячасова перакінуць бульбу з палёў у бульбахавальні, ларкі, для таго, каб яе свячасова раздаць рабочым фабрык і заводаў.

Далей з уборкай бульбы марудзіць нельга. За свячасовасьць уборкі па сыстэме Белкаапсельгасаб'яднаньня адказваюць у першую чаргу кіраўнікі дадзенага трасту.

Прадукцыя рэспубліканскай прамысловасьці

НКцяжпраму, НКлеспраму НКлёгпраму і НКснабу

за жнівень і 8 месяцаў 1932 году

ГРУПЫ ГАЛІН	Абсалютныя даныя ў цэнах 1926/27 г. (у тыс. руб.)		Прадукцыя жніўня месяца ў проц.		Прадукцыя за 8 месяцаў 1932 г. у проц. да адпаведнага перыяду 1931 году.
	За жнівень 1932 г.	За 8 месяцаў 1932 г.	Да ліпеня 1932 г.	Да жніўня 1931 г.	
Група „А"	12248,6	95117,0	99,6	84,4	112,9
Група „Б"	26585,8	238051,5	140,6	83,5	121,5
Уся прамысловасьць НКцяжпраму, НКлеспраму, НКлегпраму і НКснабу	38834,4	333168,5	124,5	83,8	118,9
У ТЫМ ЛІКУ					
НКцяжпраму	[illegible]	80806,[illegible]	98,3	[illegible]5,2	114,2
НКлеспраму	4873,3	41730,8	98,4	73,1	113,5
НКлегпраму	22902,8	204187,1	133,2	79,4	116,3
НКснабу	6355,7	56443,9	152,2	101,8	138,2

КІРАЎНІЦТВА НАРОДНА-ГАСПАДАРЧАГА ВУЧОТУ БССР

40 ГОД ЛІТАРАТУРНА—ГРАМАДЗКАЙ ДЗЕЙНАСЬЦІ А. М. ГОРКАГА

Нястомны змагар

У 1902 г. Уладзімер Ільліч Ленін, жывучы ў эміграцыі ў Лёндане, пісаў сваёй маці: «Горкага атрымаў і чытаў з вельмі вялікавасьцю (курсыў Леніна), і сам ў і другім даваў».

Ільлічу вялікую цікавасьць да Горкага ён захаваў на працягу ўсяго свайго жыцьця. Тамы кніг Горкага ён взяў з сабою высылку і эміграцыю. Ён на пасту пыці Саўнаркому, у самыя цяжкія годы грамадзянскай вайны, зачытваўся Горкім. Ільліч Леніну прысылалі вышэйшую кнігу Горкага аб Талстым, ён, як пасьля сам расказваў — «у тую ноч залпам прачытаў кнігу» і гаварыў аб ёй: «Вы ведаеце — Талстых у Горкага як жывы атрымаўся. Ба так сумленна і сьмела аб Талстым ніхто не пісаў».

У. І. Ленін на ўсіх этапах рэвалюцыі нязменна сачыў за дзейнасьцю Горкага.

Уладзімер Ільліч высока цаніў Горкага ня толькі, што Горкі ня толькі аб Талстым, але і ўсім уласьніцкім сьвеце, аб усёй культуры мінулага заўсёды пісаў, заўсёды дзейнічаў сумленна і сьмела, як сапраўдны пралетарскі рэвалюцыянер.

40 год літаратурнай і грамадзкай дзейнасьці А. М. Горкага — гэта 40 год росту і мацненьня пралетарскай культуры, 40 год барацьбы і перамог міжнароднага пралетарыяту і ў першую чаргу пралетарыяту СССР.

Гэта 40 год барацьбы за ператварэньне паўпанчыцка-капіталістычнай Расіі ў Саюз Савецкіх Рэспублік, за перамогу сацыялізму ва ўсім сьвеце.

М. Горкі правёў сваё дзяцінства і юнацтва ў цяжкіх умовах галечы і працы. Яго «універсытэтамі» былі, як ён сам расказваў, рамесная майстэрня і пякарня, параход і пустань, дзе ён прайшоў цяжкую вучобу галавечае працы, ва ўмовах царскай куцай Расіі. Горкі ведаў і кніжныя універсытэты. Ён ужо ў 1905 годзе быў адным з лепшых адукаваных пісьменьнікаў Расіі. Яго ня толькі паміж народнікамі і марксыстамі, да пачак іх ён ужо ў юнацкія годы ў Казані прыслухоўваўся, паміж меншавікамі і бальшавікамі, у барацьбе якіх ён ужо прыпенасродны ўжэл, быў ім зроблен і які дзякуючы вялізарнаму пачуцьцю мастацкага пралетарыяту, але і дзякуючы яго вялікай кніжнай культуры. Ён прыйшоў да Леніна, як мастак-мысьліцель, ня толькі адны, але ўсьвядомлены правату нашай партыі.

Пасьля паражэньня рэвалюцыі 1905 г., многія падаўна заігрываўшыя з рэвалюцыяй, сьпяшылі адрадзіць ёй, М. Горкі ізноў з большай упартасьцю застаўся на сваёй пазіцыі. У гады, калі ў часопісі «Современный мир» друкавалі «Санціна» Арцыбашава, які былы пашчэнчык Горкага па зборніку «Знание» Л. Андрэеў заяўляў, што «так было, так будзе» і заклікаў рэвалюцыянэраў «цемру» публічнага дому, М. Горкі напісаў раман «Мать», дзе ўпяршыню ня толькі ў расійскай, але і ў сусьветнай літаратуры даў шырокае палатно ператварэньня рабочага ў сьвядомага барацьбіта за ідэю пралетарыяту.

«Мать» Горкага абазначала пачатак новай кнігі ў гісторыі расійскай літаратуры — кнігі, у цэнтры якой вобраз пралетарскага барацьбіта за сацыялізм, рабочага бальшавіка, кнігі, якая створана пралетарыятам. І іменна таму найбольш значнымі зьявішчамі ня толькі пралетарскай літаратуры, але і ўсёй расійскай літаратуры паміж 2-ма рэвалюцыямі засталіся створаныя М. Горкім за гэтыя гады вялікія творы.

Застаючыся верным рэвалюцыі ва ўсе гады рэакцыі, М. Горкі асабліва паказаў сваё вялічча пралетарскага пісьменьніка ў гады імпэрыялістычнай вайны. Імпэрыялістычная вайна аказалася вялізным іспытам для ўсяго пакаленьня пралетарскіх рэвалюцыянэраў, якое сказалася ў эпоху 2-га інтэрнацыяналу. Сацыянал і нацыянал шавіністы здрадзілі рабочай клясе. І Інтэрнацыянал стаў на шлях поўнага здрадніцтва.

Горкі застаўся на інтэрнацыяналістычных пазыцыях. Ён выдае часопісь «Летопись», дзе стараецца сабраць навокал сябе ўсе інтэрнацыяналістычныя сілы, і якая да лютаўскай рэвалюцыі ў Расіі служыла трыбунай для бальшавікоў-інтэрнацыяналістаў.

Горкі аддаецца Кастрычніцкай рэвалюцыі, ідэям партыі Леніна. Ён змагаецца за перамогу рэвалюцыі.

Кожнае мастацкае слова М. Горкага было вялікім сацыяльным дзеяньнем на карысьць пралетарыяту. Але Горкі не абмяжоўваў свой удзел у пралетарскай барацьбе толькі мастацкім словам. М. Горкі, як публіцыст і грамадзкі дзеяч, заўсёды быў вялізным фактарам пралетарскай барацьбы.

Яго артыкулы апошніх год, зьвернутыя да заходняй і нашай інтэлігенцыі, яго выступленьні аб белагвардэйчыне, аб буржуазнай культуры, аб меншаніне, супроць вайны, — дакументы, з якімі ў мінулым могуць параўнаваць толькі вядомыя гістарычныя выступленьні Вольтэра, Гюго, ці Льва Талстога — з аднэй, аднак істотнай розьніцай, што артыкулы і памфлеты Вольтэра, а тым больш прамовы Гюго і артыкулы Льва Талстога былі выразам нафасу бясьсільля, крыкам вялікай болі і нянависьці. А выступленьні М. Горкага зьяўляюцца вялікім прыгаворам будаўнікоў сацыялізму над капіталістычным сьветам. І калі «Не могу молчать» Льва Талстога засталося толькі енкам бясьсільля, то такія выступленьні М. Горкага, як «Калі вораг не здаецца, яго зьнішчаюць», як «Майстрам культуры», выяўляюць грозную сілу пралетарыяту, яго рашучасьць зьнішчыць гэтых ворагаў і іх шкодніцкую культуру, яго здольнасьць на месцы ўласьніцкай культуры стварыць сваю пралетарскую сацыялістычную культуру.

І. І. Н.

ПРЫВІТАНЬНЕ АД РАМЭНА РАЛЯНА

Шлю сваё брацкае прывітаньне Максіму Горкаму з пажаданьнем, каб ён яшчэ доўга мог мужна кіраваць пралетарскай думкай СССР і ўсяго сьвету.

РАМЭН РОЛЯН.

Максім Горкі

ПЕСЬНЯ ПРА БУРАВЕСЬНІКА

Над сівою роўняй мора вецер хмарыны зьбірае. Паміж хмарамі і морам горда кружыць буравесьнік, да малынак сам падобны.

То крылом кранае хвалі, то стралой ляціць у неба, ён крычыць, і — хмары чуюць у адважным крыку радасьць.

Гэты крык — жаданьне буры! Дужасьць гневу, пал агністы і упэўненасьць у адолі чуюць хмары ў гэтым крыку.

Чайкі стогнуць перад бурай, — стогнуць, кружацца над морам і на дно яго гатовы захаваць свой жах ад буры.

І гагары таксама стогнуць, — ім, гагарам, недаступна захапляцца так змаганьнем: гром ударыў іх пужае.

Неразумны пінгвін цела ад навал хавае ў скалы... Толькі горды буравесьнік кружыць сьмела і адважна над сівым ад пены морам!

І ніжэй чарнеюць хмары, апушчаюцца над морам, і сьпяваюць, рвуцца хвалі ў вышыню насустрач грому.

Гром раўча. Стогнуць хвалі ў пене гневу ў спрэчках з ветрам. Вось ахоплівае вецер хваль чароды у абдымкі і кідае іх з размаху ў дзікай злосьці на каменьне, разьбіваючы на пырскі змарагдовыя магуты.

Буравесьнік з крыкам кружыць, да малынак сам падобны, як страла ізвае хмары, пену хваль крыльлем зрывае.

Вось ён носіца, як дэман, — горды, чорны дэман буры, — і сьмяецца і рыдае... Ён над хмарамі сьмяецца, ён ад радасьці рыдае!

У грымотах — чуткі дэман, — ён даўно утому чуе, пэвен ён, што не схаваюць хмары сонца, не схаваюць!

Вецер вые... Гром раўча...

Сінім полымем палаюць над бяздоньнем мора хмары. Мора ловіць стрэл маланак і ў сваім прадонні тушыць. Выцягі вогненыя вымеі ўпіцца ў мора і зьнікаюць адлюстроўкі тых маланак.

— Бура! Хутка грымне бура!

Гэта сьмелы буравесьнік горда кружыць між маланак над бурлівым гнеўным морам, то крычыць вышчуп адолі:

— Хай мацней ударыць бура!

Пераклад Пятра Глебкі.

З Жыцьцяпісу Горкага

МАКСІМ ГОРКІ (Аляксей Максімавіч Пяшкоў) нарадзіўся 28 (16) сакавіка 1868 ГОДУ ў г. Н. Ноўгарадзе ў сям'і абойшчыка. Пасьля сьмерці бацькі жыў у дзеда Кашырына. Сямі год Горкага аддаюць у школу, але правучыўшыся некалькі месяцаў і захварэўшы на воспу ён кідае вучэньне і больш ня вучыцца ні ў якай школе. Усе свае веды ён у далейшым набывае ад самаадукацыі. 10-ці год Горкі, пасьля сьмерці маткі, пачынае валацужнае жыцьцё. У 1878 годзе ён працуе хлепчыкам у абутковым магазыне. Далей у наступным годзе яго аддаюць у навучаньне да чарцёжніка, адкуль ён уцякае і паступае на параход па суднікам да кухара Смурага, які прывучае яго чытаць. Кухар Смуры меў вялікі ўплыў на разьвіцьцё будучага пісьменьніка, прагнасьці да кнігі, да літаратуры. У 15-гадовым узросьце Горкі ўжо ведаў творчасьць Глеба Усьпенскага, Пушкіна і Лермантава. У 1883 годзе ён працуе статыстам у тэатры на Ніжэгародзкім кірмашы, потым дзесятнікам па рамонце будынкаў. Улетку 1884 году ён едзе ў Казань для паступленьня ва універсытэт, але вучыцца Горкаму не давялося. Бяз сродкаў да існаваньня ён усё-ж прабыў рыхтавацца на сельскага настаўніка. Працуе грузчыкам, дворнікам і садоўнікам, а ў 1885 годзе паступае ў тэатральны хор, далей—падручным пекарам у пякарні.

У сьнежні месяцы 1887 году—19-ці год, стомлены непасільнай працай у цяжкіх умовах жыцьця, прабуе пакончыць самагубствам.

У Казані Горкі зблізьваецца з радыкальнымі і рэвалюцыйнымі гурткамі студэнцтва, афіцэраў і рабочых. Тут ён знаёміцца з народніцтвам і марксызмам, у гурткох чытае творы Лаўрова Чарнышэўскага, Пісарэва, А. Сьміта і «Капітал» Маркса.

У 1888 годзе разам з народавольцам Ромасам едзе ў вёску Краснавідава для рэвалюцыйнай прапаганды сярод сялянства, але пасьля падпалу кулакамі яго дому вяртаецца назад у Казань.

Улетку 1889 году едзе ў Ніжні Ноўгарад. Тут ён зблізьваецца з папітычнымі паднаглядным, сярод якіх знаходзіўся і пісьменьнік Караленка, якому ён паказвае сваю паэму «Песьня старога дуба» і карыстаецца яго літаратурнымі парадамі.

У 1890 годзе пачынаецца валацужнае жыцьцё па Расіі. Горкі прайшоў Паволожжа, Данскую вобласьць, Украіну і Каўказ. У Тыфлісе ён працуе ў чыгуначных майстэрнях, дзе сустракаецца са ссыльным Калюжным, які меў вялікі ўплыў на пачатак яго літаратурнай пісьменьніцкай дзейнасьці. У 1892 годзе ў газэце «Каўказ» зьявілася першае апавяданьне Горкага—«Манар Чудра». У 1895 годзе ў «Русском богатстве» быў надрукаван «Челкаш». У 1898 годзе асобным выданьнем выйшлі яго апавяданьні. Да 1900 году Горкі зьяўляецца ўжо вядомым і ўлюбёным пісьменьнікам.

Каля 1901 году ён зблізьваецца з найбольш актыўнай часткай нацыянал-дэмакратыі, згрупаванай вакол «Искры», якою кіраваў Уладзімер Ільліч Ленін.

Горкі некалькі разоў быў арыштаваны. Пасьля 9 студзеня 1905 году, за складзеную ім адозву ён быў пасаджан у Петрапаўлаўскую цытадэль, дзе прасядзеў каля 3 месяцаў.

З 1906 па 1913 год жыве заграніцай, адкуль рэзка выступае супроць расійскага самаўладзтва. Агітацыя Горкага адабрала ў яго магчымасьць вярнуцца назад у Расію. Ён кіруе шчыльней далучаецца да бальшавікоў. Заграніцаю ён жыве ў паўднёвай Італіі (востраў Капры) дзе разам з Луначарскім і інш. арганізоўвае для рабочых з Расіі партыйную школу.

Імпэрыялістычную вайну Горкі сустракае з вялікім абурэньнем. У 1915 годзе пад яго кіраўніцтвам выдаецца часопісь «Летопись». У часе лютаўскай рэвалюцыі выдае газэту «Новая жизнь».

Пасьля Кастрычніцкай рэвалюцыі Горкі прымае актыўны ўдзел у сацыялістычным, культурным будаўніцтве краіны Саветаў. Ён арганізуе дапамогу навуковым працаўнікам, арганізуючы ЦЕКУБУ, выдавецтва «Всемирная литература», пішэ вядомую характарыстыку Леніна ў «Коммунистическим Интернационале» (1920 год). У 1921 годзе па дамаганьні Леніна Горкі выехаў заграніцу лячыцца. Разам з новымі мастацкімі творамі («Мои университеты», «Дело Артамоновых» і «Жизнь Клима Самгина») Горкі пачынае выступаць у заграніччным друку супроць цкаваньня Савецкай краіны былымі эмігрантамі.

У 1928 годзе, у сувязі са сваім 60-гадовым юбілеем, Горкі вяртаецца ў СССР, дзе яго сустракаюць з вялікім энтузіязмам і любоўю. Тут Горкі пачынае вывучаць дасягненьні нашага сацыялістычнага будаўніцтва, выступае з прамовамі на мітынгах і сходах, вядзе перапіску з рабкорамі і селькорамі.

За апошніх сорак год ня было ні аднаго культурнага пачынаньня, разьлічанага на масы вясьць, у якім Горкі не адыгрываў-бы выдатнейшай ролі.

З ліку апошніх яго пачынаньняў: «Гісторыя грамадзянскай вайны». «Гісторыя фабрык і заводаў», «Жыцьцё выдатных людзей», «Бібліятэка паэтаў», «Малады чалавек XIX стагодзьдзя», задуманае выданьне «Адкуль для ўсяго сьвету», часопісі «Наши достижения» і «За рубежом», часопісь для пачынаючых пісьменьнікаў «Литучеба»,—усе гэтыя вялікія і розностайныя справы арганічна зьвязаны з Горкім.

Ад навуковых работнікаў БССР

Буравесьніку сусьветнай пралетарскай рэвалюцыі ў дзень 40-гадовага юбілею яго літаратурнай і грамадзкай дзейнасьці, ЦБ СНП БССР шле палкае пралетарскае прывітаньне.

Дарагі Аляксей Максімавіч! Сорак год вашай творчай дзейнасьці зьяўляюцца аднэй з самых бліскучых старонак у кнізе росту і разьвіцьця пралетарскай культуры, у гераічнай барацьбе міжнароднага пралетарыяту за сацыялізм, у барацьбе СССР, як ударнай брыгады сусьветнай пралетарскай рэвалюцыі.

Ужо ў першых сваіх творах вы кінулі вызлік рэакцыйна-грусьлівай тэорыі і практыцы чэхаўскай інтэлігенцыі, капітулянцкай пакорнасьці перад самаўладзтвам Дастаеўскага і рэакцыйнай філёсофіі непраціўленьня злу Талстога. Ужо тады вы сталі пасьляром легендарна-дзейсных людзей, адважных сокалаў, сьмелых буравесьнікаў надыходзячай пераможнай буры.

Прыйшоўшы да бальшавіцкай партыі і да яе кіраўніка Леніна, вы ў эпоху самай чорнай рэакцыі пасьля 1905 году, у эпоху разгула «Вех», паказаньня «Цемры» і «Санціна», засталіся вернымі справе пралетарыяту, паказаўшы ў сваёй творчасьці зьвярыны твар расійскай буржуазіі і тупую лютасьць расійскага мяшчанства, процістаўшы ім сапраўдныя вобразы рабочых, якія становяцца на шлях сьвядомай барацьбы за сацыялізм.

Пасьля Кастрычніцкай рэвалюцыі вы сталі трыбунам нашых дасягненьняў перад працоўнымі ўсяго сьвету і выкрывацелям контррэвалюцыйнай сутнасьці «мэнэнчыкаў грамадзян» і заалёгічнай нянавісьці да краіны Саветаў з боку сусьветнага фашызму і сацыял-фашызму. Вы сталі настаўнікам і другам, выхоўваючы буйныя творчыя ўсходы рабселькораў і пачынаючых пісьменьнікаў, вы правялі вялізарную ініцыятыву ў справе арганізацыі гісторыі грамадзянскай вайны і гісторыі фабрык і заводаў.

Дарагі Аляксей Максімавіч! Сьвяткуючы юбілей вашай сарокагадовай барацьбы за справу сацыялізму, ЦБ СНП БССР жадае вам яшчэ на працягу доўгіх год таксама няўхільна і пасьлядоўна ісьці на перадавым посту фронту сацыялістычнай будоўлі, барацьбы за бясклясавае грамадзтва і стварэньне магнітабудаў сацыялістычнай літаратуры.

Выдатнейшаму пралетарскаму мастаку

60 год. Мужны голас Максіма Горкага набіраў моцы і ў струмені яскравых вобразаў, са шчытых дыялёгаў, насычаных рэвалюцыйным пафасам, асуджае агідны, згубны для чалавека капіталізм, заклікае надыход рэвалюцыйнай буры.

З юнацкай чуласьцю і таварыскай рупнасьцю Максім Горкі выяўляе і вырошчвае вольныя парасткі пралетарскай літаратуры, што ўзьнімаюцца з заціснутых капіталістычнымі краінамі нізоў, з працоўных гушчаў.

Бура пралетарскай рэвалюцыі змагла сваёй моцнай паводкай зьнішчыць капіталістычны лад на прасторах аднэй шостай зямнае кулі, пракацілася магутным рэхам па ўсім сьвеце, абудзіўшы мільёны працоўных да баёў за сацыялістычны лад. На аднэй шостай частцы сьвету, дзе кіруе ленінскі пралетарскі авангард, пераможна будуецца сацыялізм. І Максім Горкі, поўны рэвалюцыйнага энтузіязму, у першых радох пралетарскіх будаўнікоў СССР, першы буравесьнік сусьветнай пралетарскай рэвалюцыі.

Чуюць голас Максіма Горкага і ўсе ворагі СССР, чые зладзейскія інтэрвэнцыяністкія пляны і варыцкую прагнасьць да нажывы выкрывае і бічуе ён.

Гарачае прывітаньне выдатнейшаму пралетарскаму мастаку, пачэсному, дзейнаму ўдарніку сацыялістычнай будоўлі, кіраўніку і актыўнаму ўдзельніку пасьпяховага росту пралетарскай, савецкай літаратуры.

Інстытут літаратуры і мастацтва БАН.

Ф. КАНАЕЎ

МАКСІМ ГОРКІ

«Горкі — безумоўна буйнейшы прадстаўнік пралетарскага мастацтва, які шмат для яго зрабіў і яшчэ можа зрабіць ... Горкі — аўтарытэт у справе пралетарскага мастацтва, гэта бясспрэчна... У справе пралетарскага мастацтва М. Горкі ёсьць вялізарны плюс» (Ленін).

МАКСІМ ГОРКІ—ЧЫРВОНААРМЕЕЦ І ЎДАРНІК САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА БУДАЎНІЦТВА

Рэвалюцыйнае слова Горкага адкрывае вочы адсталым працоўным масам на іх мэты і задачы, жоклікае да барацьбы з прыгнятальнікамі. Вось чаму імя Горкага выклікае такую адкідушную нянавісьць у капіталістаў усяго сьвету.

Сусьветная буржуазія, ці то ангельская, французкая, амэрыканская, ці італьянская, у выступленьнях Максіма Горкага чуе ня толькі галасы ўдарнай брыгады сусьветнага пралетарыяту—СССР, завяршыўшага фундамент сацыялістычнай эканомікі, але і гнеўныя галасы рабочых сваёй краіны.

Рэвалюцыйны Кітай, вітаючы пісьменьніка, гаворыць:

«Вялікая колькасьць вашых кніг бязупынна адкрывае вочы адсталым працоўным масам, выклікае ў іх клясавую нянавісьць і заклікае іх да барацьбы».

Зьвяртаючыся да працоўных Савецкага саюзу, Горкі сказаў:

«Мы ўсе павінны зразумець сябе як Чырвоную армію пралетарыяту ўсяго сьвету: ўсе — работнікі на палёх і на фабрыках, работнік, узброены вінтоўкай і ўзброены пэрам. Мы жывем ужо 14 год у баі, — гэта ваш вялікі, будзённы, але вялікі бой з бясформенным мэталем, з якога вы ствараеце разумныя машыны, з зямлёй, якую вы прымушаеце даваць багатыя ўраджаі, бой пад зямлёй, дзе вамі здабываецца вугаль, бой на транспарце, у зімнія ночы, супроць сьнежных завірух, — усюды вы вядзеце бой словам і справай.

І калі вам прыдзецца выйсьці на поле бітваў супроць старога сьвету са зброяй у руках—на гэты апошні бой выйдзе першая ў сьвеце армія, кожны баец якой будзе зусім дакладна і ясна ведаць, за што ён змагаецца, хто яго сапраўдны вораг, будзе ведаць, што вораг гэты асуджаны гісторыяй на пагібель і што пагібель яго — пачатак шчасьця працоўных усёй зямлі».

Зварот Горкага ў краіну выклікаў новую хвалю творчага энтузіязму сярод рабочых мас і новую хвалю злосьці і нарэшце на Максіма Горкага з боку клясавых ворагаў пралетарыяту.

Ліквідуемае на аснове сацыяльнай калектывізацыі кулацтва, зграя «мэханічных грамадзян», пераклікаецца з сусьветным капіталам у нападках на пралетарскага пісьменьніка.

Вораг баіцца, што М. Горкі прыехаўшы ў СССР яшчэ больш узмоцніць творчую работу па барацьбе з парахнелым, разьдзіраючым супрэчнасьцямі капіталістычным сьветам, па будаўніцтве сацыялізму, па стварэньні новай пралетарскай культуры і савецкай літаратуры, вартай вялікае клясы будаўніка сацыялізму — ударнага атраду ў сусьветным рэвалюцыйным руху.

Цікаваньне і вызьцьё ворага супроць Горкага працоўных СССР і ўсяго сьвету расцэньваюць, як новы доказ падрыхтоўкі сусьветнага капіталу да вайны супроць СССР — сацыялістычнай бацькаўшчыны пралетараў усяго сьвету.

Вітаючы Горкага, рабочая кляса Савецкага саюзу вітае ў яго асобе **рэвалюцыйнага байца і будаўніка сацыялізму.**

ШЛЯХ М. ГОРКАГА—ШЛЯХ ПРАЛЕТАРСКАГА МАСТАКА

Творчы шлях пралетарскага пісьменьніка Максіма Горкага — гэта, перш за ўсё, шлях палітычнага барацьбіта з царызмам і капіталізмам. Горкі нарадзіўся ў 1868 годзе. У 1892 годзе было надрукавана яго першае апавяданьне «Макар Чудра». У 1895 годзе загучэла яго «Песня о соколе»:

«Безумство храбрых — вот мудрость жизни. О, смелый сокол! В бою с врагами истек ты кровью... Но будет время — и капли крови твоей горячей как искры вспыхнут во мраке жизни и много смелых сердец зажгут безумной жаждой свободы, света.

«Безуместву храбрых поем мы песню...»

Гэтыя словы прагучэлі ў цемры царызму яшчэ за дзесяць год да рэвалюцыі 1905 году.

Пачатак творчасьці Максіма Горкага непасрэдна сувязі з разгортваньнем рабочага руху. У гэтыя гады зараджалася і фармавалася баявая партыя рабочае клясы, у краіне, дзе лібэральная буржуазія ўжо нядзольна была ўзначаліць насьпяваючую ў супрэчнасьцях буржуазна-дэмакратычную рэвалюцыю і напалоханая сілай рабочага руху ішла на здзелкі з царом. У царскай Расіі гісторыя высоўвала ў павадыры, у гегемоны паўат буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі рабочую клясу.

Песьня «Безуместву храбрых» ня гучэла ў тон ні буржуазіі, ні меншавізму, прадракальнікі якога ў той час—эканамісты, прапаведзвалі толькі барацьбу за пятачок.

«Медленным шагом, робким зигзагом
Марш, марш вперед, рабочий народ».

Такава была песенька эканамістаў, гэтых прадракальнікаў меншавізму, заклікаючых верыць, што буржуазія акажацца рэвалюцыйнай у барацьбе з царызмам, а рабочым, моў, трэба толькі дапамагчы буржуазіі ў гэтай барацьбе. Самім-жа рабочым застаецца змагацца з буржуазіяй толькі за паляпшэньне эканамічнага становішча, не ставячы ніякіх палітычных задач.

І творчасьць Максіма Горкага ўжо ў першы, рамантычны пэрыяд адлюстроўвала сваёй рашучасьцю заклік да барацьбы той гістарычны факт, што ў глыбінях клясавай барацьбы ўзьнімаўся дзевяты, самы моцны, вядучы вал — хваля рэвалюцыйнага рабочага руху, адлюстроўвала той факт, што на аране клясавых баёў з царызмам і з капіталізмам рабочая кляса выступае павадыром і гегемонам рэвалюцыі.

У апавяданьні «Озорник» рэдактар лібэральна-брахлівай газэткі заклапочан і абуран «озорной» праўкай рабочага.

«Наша фабрычнае законадаўства заўсёды служыла прадметам гарачага абгаварэньня»... і далей ідзе «озорная» ўстаўка рабочага-друкара: « ... г. зн. глупай ерунды і бязглузьдзіцы. Абуранаму рэдактару азарны рабочы так тлумачыць сваю праўку:

«Вы пра палкага рабочага гаворыце... а я ўсё чытаю... І агідна мне чытаць. Адны словы бессаромныя... бо вы пішаце — не рабуй, а ў друкарні-ж у вас што? Кір'якоў на мінулым тыдні працаваў тры з паловаю дні, выпрацаваў 3 р. 80 грывень і захварэў. Жонка прыходзіць у кантору па грошы, а кіраўнік спраў ёй гаворыць, што ня ёй даць, а з яе трэба 1 р. 20 атрымаць штрафу. Вось табе і не рабуй».

У гэтым маленькім эпізодзе Горкі яшчэ ў 1897 годзе выкрывае палітычны сэнс заігрываньня лібэральнага марксызму з рабочымі — сапраўдную цану буржуазных клопатаў аб рабочым законадаўстве. Выкрывацца клясавы характар буржуазнага друку, звонам пустых прыгожых слоў затуманьваючага сьвядомасьць рабочых.

Успомнім, якія клясы і партыі дзейнічалі напярэдадні рэвалюцыі 1905 году, заклікаючы да **рашучай** барацьбы з царызмам, якія не забывалі гаварыць аб трусасьці, рыхласьці буржуазіі; такой клясаю была толькі рабочая кляса, яе рашучасьць была антымістычнай рашучасьцю. Бадзёрая ўпэўненасьць, гучэўшая ў творчасьці і раньняга Горкага, адлюстроўвала сабой, што на аране клясавай барацьбы здольна змагацца і да канца давесьці барацьбу толькі рабочая кляса.

ТУРМА І ССЫЛКА—РЭВАЛЮЦЫЙНАЯ ШКОЛА ГОРКАГА

Царскі ўрад рана пачаў клапаціцца аб рэвалюцыйным выхаваньні пісьменьніка. Арышты і вобыскі, ссылкі, нягласны надзор паліцыі, турма, Петрапаўлаўская цытадэль—вось этапы яго творчай работы. Упяршыню Горкі быў арыштован у 1889 годзе ў Ніжнім, праз 3 гады ў Майкопе, а ў 1898 годзе знаёміўся з тыфліскай турмой.

Царызм хутка зразумеў глебу, на якой вырастаў талент Максіма Горкага. Гэтай глебай быў рэвалюцыйны рабочы рух. І апанаўшы сілу і значэньне мастацкага слова пісьменьніка, царская жандармэрыя адразу-ж расчыніла перад ім браму турмы.

Аднак, калі ўраднікі царскага ладу маглі схаваць Горкага ў турму — суцішыць шум рэвалюцыйнага руху і прымусіць пісьменьніка замаўчаць яны ня мелі моцы.

У 1901 годзе Горкі піша посьню аб «Буревестнике». У песьні прагучэла «сіла гневу, полымя запалу, і ўпэўненасьць у перамозе».

Горкі з агідай паказвае чаек, гагар, тлустых пінгвінаў, якія баяцца навальніцы, баяцца рэвалюцыі. Лібэральныя буржуа, іх трусьлівыя слобаблуды, рэдактары-інтэлігенты, крохаборчае мяшчанства—з поўнай падставай магла бачыць партрэты сваёй клясы іменна ў гэтых трусьлівых птушках.

Іх палохаў сьмелы заклік «Пусть сильнее грянет буря».

Царызм не пакідае ў спакоі Максіма Горкага. У адказ на пратэст Горкага супроць збойства дэманстрантаў, у адказ на яго баявую творчасьць, урад арыштоўвае Горкага ў Ніжнім, абвінавачваючы ў набыцьці мімэографа для выданьня «злачынных адозваў да сормаўскіх рабочых».

Але для ўвагі царызму да Горкага даволі было яго мастацкай творчасьці, якая ў сваёй аснове, у сваёй сутнасьці была заклікам ня толькі да сормаўскіх рабочых, а да рабочых усёй Расіі, да ўсіх рэвалюцыйных мас.

Ленін у 1901 годзе адначае дэманстрацыю ў Ніжнім у сувязі з высылкай Горкага з Ніжняга:

«Узбуджэньне ўсюды расьце, і неабходнасьць аб'яднаць яго ў адзіны паток **супроць самаўладзтва,** сеючага ўсюды свавольле, прыгнечаньне і гвалт, становіцца ўсё больш настойлівым. У Ніжнім невялікая, але ўдала прайшоўшая дэманстрацыя 9 лістапада была выклікана провадамі Максіма Горкага. Эўрапэйска-выдатнага пісьменьніка, уся зброя якога заключалася — як правільна сказаў прамоўца Ніжагародзкай дэманстрацыі — у свабодным слове, самаўладны ўрад высылае бяз суда і следзтва з яго роднага гораду. Башыбузукі абвінавачваюць яго ў благім уплыве на нас... а мы заяўляем, што гэта быў добры ўплыў...» (Ленін, т. IV, стар. 345-346).

Цар пацьвердзіў ацэнку мастацкай творчасьці Горкага, як накіраванай да расхістаньня трону і асноў дзяржавы расійскай тым, што ў 1902 годзе не пацьвердзіў выбараў Горкага ў гапаровыя акадэмікі.

У 1905 г. Горкага арыштоўваюць у Рызе і саджаюць у Петрапаўлаўскую цытадэль. Але і пасьля 1905 г. Горкі не пакідае барацьбы з царызмам. Ён выступае ў 1906 г. у друку з пратэстамі супроць пазыкі расійскага ўраду ва Францыі.

ТВОРЧАСЬЦЬ ГОРКАГА — ЗБРОЯ ПРАЛЕТАРЫЯТУ

Асаблівую нянавісьць, пагарду, крыкі буржуазнай крытыкі аб лапы Горкага выклікала аповесьць «Мать», адзін з вялікіх мастацкіх твораў. У ім ясна адчуваецца завострая палітычная накіраванасьць Горкага, разгорнутая як заклік да барацьбы праз вобразны паказ і аднаўленьне клясавай барацьбы, якая толькі што разгралася.

«Я павінен заявіць, што для нас самаўладзтва не зьяўляецца адзіным ланцугом, акаваўшым цела краіны, яно толькі першы і бліжэйшы ланцуг, які мы абавязаны сарваць з народа».

Гэтыя словы з прамовы Паўла выкрываюць асноўную накіраванасьць аповесьці.

У 1907 годзе Горкі дэлегат ад бальшавікоў з дарадчым голасам на Лёндэнскім зьезьдзе РСДРП.

Горкі ўвесь час вядзе далей вялікую творчую работу. У 1909-1913 г. ён дае «Городок Окуров» — бязьлітаснае, поўнае нянавісьці і пагарды выкрыцьцё трусьлівасьці і косасьці дробнай буржуазіі, павятовага расійскага мяшчанства, «Детство» і рад другіх твораў. У 1908 г. выйшла аповесьць Горкага «Исповедь», якая сустрэла суровы і заслужаны адпор за памылковыя ідэі «богостроительства».

На гэты пэрыяд падае вялікая перапіска Леніна з Горкім — узор ленінскай ідэйна-выхаваўчай работы. Гэта перапіска безумоўна адыграла вялікую ролю ў творчым фармаваньні Горкага, і будзем спадзявацца, што Горкі яшчэ сам нам раскажа аб гэтым.

У часе імпэрыялістычнай вайны Горкі займае інтэрнацыяналісцкія пазыцыі. Рэдагаваны ім журнал «Летопись» вядзе антымілітарысцкую прапаганду.

Інтэрнацыянальная пазыцыя М. Горкага зразумела, калі прачытаць творы Горкага, якія паказвалі як расійскую буржуазію («Фома Гордеев», «Жизнь Матвея Кожемякина»), так і сусьветную («Город желтого дьявола», «Прекрасная Франция»).

«Фома Гордеев» выйшаў у 1899 г. Пазьней у аповесьці «Мать» Горкі паказаў, як павінна канчацца прыпыненьне і перахоўзіць ад настрояў пратэсту і абурэньня да арганізаванай барацьбы пралетарыяту.

У сваіх далейшых творах: «Жизнь Матвея

40 год літаратурна—грамадзкай дзейнасьці А. М. Горкага

Максіму Горкаму

Слаўны, пячувана слаўны шлях прайшлі вы, Аляксей Максімавіч, за сорак год сваёй бурнай магутнай рэвалюцыйна-літаратурнай творчасьці, рэвалюцыйна-грамадзкай дзейнасьці.

Сонца ўзыходзіла, сонца заходзіла, а вы, як той легендарны Промэтэй, сваімі агністымі пяруновымі славамі распальвалі сэрцы, разбунтоўвалі думкі да вялікага змагання, змаганьня за вызваленьне чалавецтва з адвечных ланцугоў няволі, ланцугоў пяроўнасьці, ланцугоў панаваньня чалавека над чалавекам.

Але Промэтэя лягенда прыкавала да каўкаскай скалы і ён не пабачыў нявыказанай карысьці сьвятла для ўсяго жывога на жыватворчай зямлі. Доля-ж ваша, Аляксей Максімавіч, іншая: вад вамі сягоньня шалясьцяць чырвоныя сьцягі нябывалай гераічнай перамогі шостай часткі сьвету над сацыяльным і нацыянальным рабствам, і вы сваімі яснымі вачыма бачыце гэтую перамогу, перамогу, дзе ёсьць і ваша заслуга, заслуга вашага творчага генія.

На разбушаваным моры хваля за хваляй, вал за валам біліся аб недаступныя, непадатныя скалы, на якіх адны арлы гаснарэлі. На прасторах неўтамоннага жыцьця разьбівалася аб вашу непахіласьць, аб вашу ясназорную сумленнасьць усё абманнае, нікчэмнае, і вы сьмела і горда пялі «Песьню аб сокале», прарочылі «Буравесьнік» ўсяму скаванаму сьвету.

Думы вашы, заклікі вашы, сягаючы ўсюды, дзе толькі «сонца ўзыходзе і заходзе», далятаді і ў краіну, дзе адно нявольніцтва і цэкра вілі сабе жудаснае панаваньне. Рэвалюцыя зьмяла пазаўсёды няволю і цэмру з гэтае краіны. І сягоньня добрым словам, шчырым сэрцам сьвяткуе вона сьвята вольная Беларуская Сацыялістычная Рэспубліка.

«Безумству храбрых поем мы славу».

Янка Купала.

Мінск, 22-IX—32 г.

Любімаму пісьменьніку рабочых мас

(З прывітаньня УсеЦСПС)

УсеЦСПС ад імя 17 млн. арганізаваных пралетараў вітае вялікага майстра пралетарскай літаратуры, любімага пісьменьніка рабочых мас—Максіма Горкага ў дзень слаўнага 40-годзьдзя плённае творчай работы, рэвалюцыйнай барацьбы, перамогі пралетарскай сірады. Мастацкі геній Горкага ўгрос, умацаваўся ў непарыўнай сувязі з ростам рэвалюцыйнага мастацтва рабочай краіны нашай краіны. Гераічная барацьба пралетарыяту, яго ленінскі-сталінскай партыі ў барацьбе за сацыялізм, у барацьбе за стварэньне новай сацыялістычнай культуры, новага чалавека, барацьба супроць духоўнай тупасьці, мяшчанства, «дзічаньня буржуазнага грамадзтва—весь творчы сьцяг Горкага, пад якім ён згуртоўваў і згуртоўвае растучыя сілы пралетарскай літаратуры. Пад кіраўніцтвам Горкага ў 1914 г. выйшаў першы зборнік пралетарскіх пісьменьнікаў і паэтаў. Зараз-жа тысячы, дзесяткі тысяч рабочых удзельнікаў прымаюць удзел у масавым літаратурным руху. Калектыўна стварацца пачатая па ініцыятыве Горкага гісторыя фабрык і заводаў, гісторыя грамадзянскай вайны, вялікія дакументы гераічнай эпохі пралетарскай рэвалюцыі.

Рабочая кляса Савецкага саюзу бачыць у творы Максіма Горкага лепшага пралетаўніка ўсёй рэвалюцыйнай інтэлігенцыі, які бездапаможна б'ецца стары сьвет праклятага капіталізму, скінуты пралетарскай рэвалюцыяй у СССР, б'е белых эмігрэнтаў, натхніцеляў і арганізатараў інтэрвэнцыі, правадыроў II-га інтэрнацыяналу, блізарукіх нацыфістаў, мяшчан, шыпячых з-за кута, усіх ворагаў краіны Саветаў!

Прывітаньне Анры Барбюса

Я ганаруся тым, што маё імя зьявіцца сярод імён іншых культурных работнікаў, якія ў дзень юбілею Горкага будуць ушаноўваць чалавека, які на працягу 40 год быў на чале сучаснага літаратурнага руху. Я гавару: «Наш вялікі Горкі», лічачы, што яго слава, яго твор часьць належаць нам усім, нават ня толькі тым з нас, хто па сваім грамадзянскім становішчы, ці па сваіх поглядах, як я, зьяўляюцца грамадзянамі савецкай краіны.

Прыклад Горкага вучыць інтэлігента, як трэба рэагаваць на грамадзкую драму. Ён ускрыў лёгічную неабходнасьць, нямінучасьць перамогі сілы грамадзкай над сілай асабістай.

Мастак ня можа ня ўключыць сваю творчую работу ў плян грамадзкага працэсу, які ў нашыя дні ўвасабляецца ў форму прагрэсу сацыялістычнага.

Не без хваляваньня я ўспамінаю адну гутарку, у ходзе якой Горкі ўказаў на важнейшыя пункты пляну дзеяньня для мастака. У наш час ён вялікі сьветач, які адкрывае новыя шляхі ў цэлым сьвеце.

Усім сэрцам і ўсім розумам мы вітаем вялікага майстра субрата.

АНРЫ БАРБЮС.



Мятэхскі замак у Тыфлісе куды быў заключаны М. Горкі ў 1898 годзе.

Сусьветнаму пралетарскаму пісьменьніку

Дарагі тав. Горкі!

Міжнароднае аб'яднаньне рэвалюцыйных пісьменьнікаў ад імя ўсіх рэвалюцыйных пісьменьнікаў Захаду і Ўсходу вітае вас з 40-годзьдзем вашай літаратурнай дзейнасьці. Савецкія работнікі літаратуры і рэвалюцыйныя пісьменьнікі капіталістычнага сьвету ка лёніяльных краін, якія руйнуюцца і прыгнечваюцца, ушаноўваюць у вашай асобе першага пралетарскага пісьменьніка краіны, якая стала бацькаўчынай усіх працоўных, ушаноўваюць першага пралетарскага пісьменьніка ўсяго сьвету. Вы ня толькі самі падавалі прыклад работы. Вы навучылі тэму, што літаратура ёсьць зброя ў клясавай барацьбе. Мільёны рабкораў чэрпаюць вопыт і бадзёрую ўпэўненасьць у пасьціхаючай публіцыстычнай рабоце вялікага рабкора Максіма Горкага!

Маскоўская асацыяцыя рабочых аўтараў у сваім прывітаньні ўказвае:

«Сёньняшні юбілей — лепшае сьвята пралетарскай культуры, перамога сусьветнага пралетарыяту, якому твая творчасьць заўсёды служыла. Твая творчасьць зьяўляецца выключным узорам упартасьці, настойлівасьці, выключным прыкладам перамаганьня ўсіх перашкод, прыкладам гераічнай барацьбы за высокі ўзровень сьветапогляду, мастацкага майстэрства.

«ВАРНТСО» ў дзень 40-гадовага юбілею літаратурнай творчасьці шле вам, нястомнаму энтузіясту сацбудаўніцтва, творцу пралетарскай літаратуры сваё гарачае таварыскае прывітаньне. Шлях вашага жыцьця, літаратурнай творчасьці непадзельна зьвязан з рэвалюцыйным рухам і барацьбой рабочае клясы. Мільёны, якія ажыцьцяўляюць вялікія пляны сацыялістычнай будоўлі, ведаюць свайго Горкага, яны ня раз знаходзілі ў яго бадзёрым слове дадатковую крыніцу энтузіязму і энэргіі.

Табе, пачэснаму члену нашага саюзу ў дзень 40-годзьдзя тваёй літаратурнай дзейнасьці, ЦК друкароў шле таварыскае прывітаньне. Вялікі майстар рэвалюцыйнага слова, першы рабочы карэспандэнт, ты пучыш рабочых і сялян усяго сьвету змагацца за сацыялізм. Жадаем табе доўгія гады захаваць сілы і здароўе, убачыць перамогу сацыялізму ва ўсім сьвеце.

ЦК Саюзу друкароў.

Рэдакцыя «Гістырыя грамадзянскай вайны» піша:

«Па вашай ініцыятыве стварэецца гісторыя гераічнай узброенай барацьбы рабочых, працоўных сялян за права самім, па-свойму, будаваць жыцьцё. Гэта адна са слаўных спраў, якая складае вялікі зьмест вашай 40-гадовай літаратурна-грамадзкай дзейнасьці. Ваш заклік падхоплен шырокімі масамі працоўных Савецкага саюзу. Пачатая вамі справа стала іх справай. У гэтым зэрука таго, што разам з вамі яна будзе завершана, яна паслужыць канчатковай перамозе будаўнікоў сацыялізму.

Міжнароднае рабочае тэатральнае аб'яднаньне, у складзе якога змагаюцца за мастацтва сусьветнай пралетарскай рэвалюцыі, мастакі сцэны і масавыя пралетарскія тэатральныя арганізацыі **Нямеччыны, Англіі, Францыі, Японіі, ПАЗШ, Гішпаніі, Галяндыі, Аўстрыі, Швэйцарыі, Бэльгіі, Швэцыі і СССР,** шле палкае пралетарскае прывітаньне дарагому Максіму Горкаму — першаму ўдарніку сусьветнага пралетарскага мастацтва, у дзень яго слаўнага юбілею.

АГЛЯД ДРУКУ

Рэгістратар і арганізатар

„За бальшавіцкія перамогі", „Сельмашац", Гомель

Сотні перарасталі ў тысячы. Тысячы—у сотні тысяч рублёў. І гэта толькі за лікі-небудзь 30-40 дзён. Гутарка ідзе,па -першае,—аб Гомельскім дрэваапрацоўчым камбінаце і, па другое,—аб эканоміі, якую дасьць гэтаму прадпрыемству **рэалізацыя ра бочых прапаноў.**

На камбінаце па ініцыятыве заводзкай газэты **«За бальшавіцкія перамогі»** быў праведзен масавы збор вытворчых прапаноў ся род рабочых і інжынэрна-тэхнічных работнікаў. Як праходзіў сам збор—невядома. У газэце зьмяшчаліся толькі апэрацыйныя зводкі паступленьня прапаноў з усіх цэхаў камбінату. Відавочна, што была праведзена сур'ёзная, вялікая работа. Аб гэтым сьведчаць рэальныя вынікі. За адны першыя 20 дзён па Гомельскім дрэваапрацоўчым камбінаце

«...ПАСТУПІЛА 156 ПРАПАНОЎ, У ТЫМ ЛІКУ АД ІНЖЫНЭРНА-ТЭХНІЧНЫХ РАБОТНІКАЎ—79 І АД РАБОЧЫХ—76».

У далейшым гэта лічба перасягнула 200. Паступілі каштоўнейшыя прапановы, частка якіх мае ўсесаюзнае значэньне. Радавыя рабочыя, камандзіры прамысловасьці—інжынэры, калектыўна і паасобна шукалі лепшых, удасканаленых, больш эфэктыўных спосабаў арганізацыі вытворчасьці на камбінаце, думалі, як, якім чынам дабіцца большай прадукцыйнасьці ад кожнага мэханізму.

Збор ярка паказаў, якой магутнай сілай зьяўляецца рабочая ініцыятыва. З разгледжаных 100 прапаноў, была ухвалена і прынята 71 прапанова. Іх рэалізацыя з'эканоміць камбінату

«...МІНІМУМ 250.000 РУБ.».

Гэта—ад 71 прапановы, а іх на камбінаце за час збору паступіла амаль 240.

Справа, аднак, ня толькі ў тым, каб сабраць прапановы. Гэта яшчэ паўдарогі. Галоўнае ў тым, каб кожная прапанова была хутка і ўсебакова разгледжана, каб кожная прынятая прапаноа была **рэалізавана.** Гэтага на камбінаце, скромна кажучы, недаацанілі. Там іменна і спыніліся на паўдарозе. Абмеркаваньне прапаноў праходзіла павольна, а іх практычнае ажыцьцяўленьне яшчэ павольней. Важнейшыя вынаходзтвы і па сёньняшні дзень ніяк ня могуць дачакацца шчасьця ўбачыць цэхі камбінату. Сама рэдакцыя прымушана была забіць трывогу. Газэта яшчэ ў маі пісала, што:

«...ЗБОР (з другой паловы сакавіка і па май.—Рэд.) **прапаноў прашоў пры вялікай актыўнасьці ўсіх рабочых і інжынэрна-тэхнічных работнікаў камбінату, РЭАЛІЗАЦЫЯ-Ж ПРАПАНОЎ ПРАХОДЗІЦЬ МАРУДНА».**

Адной трывогай пытаньня ня вырашыш. Газэта прымае, так сказаць, канкрэтныя меры. На яе старонках з'яўляюць 9 інжынэраў і тэхнікаў камбінату. Кожны іх праз газэту дае слова забясьпечыць поўнае выкананьне паўных прапаноў да канца мая. Пахвальныя абяцаньні... Але бяда ў тым, што яны так і засталіся абяцаньнямі. Далейшы лёс прапаноў пакрываецца цьмянай тайнай.

Абяцаньні даваліся ў маі, а сёньня, як вядома, ужо канчаецца верасень. Часу прайшло, як бачыце, больш чым даволі. Што-ж з прапановамі? Невядома. Іх лёс застаецца сакрэтам рэдакцыі. Толькі ў ліпені ўсяго адзін раз газэта мімаходам успомніла, што

«...РАБОЧЫЯ ПРАПАНОВЫ ЗАТРЫМЛІВАЮЦЦА ЯШЧЭ І ПА СЁНЕШНІ ДЗЕНЬ».

Тут-жа падаюцца проста забойчыя факты. Аказваецца, рад каштоўных прапаноў, якія ўдасканальваюць вытворчыя працэсы і даюць значную эканомію, на камбінаце і на зьбіраюцца праводзіць у жыцьцё. Вывады газэты такія неканкрэтныя і абязьлічныя, што, зразумела, ні адзін з глушыцеляў рабочай ініцыятывы іх не спалохаецца. Рэдакцыя толькі ў спакойным і агульным тоне патрабавала:

«...больш адказнасьці за рэалізацыю рабочых прапаноў».

Ці мела сябе на ўвазе сама рэдакцыя, калі патрабавала «большай адказнасьці», ці не—невядома. Але факт, што з таго часу і па сёньняшні дзень рабочым прапановам так і не пашчасьлівілася прыцягнуць увагу газэты «За бальшавіцкія перамогі».

Гомельскі дрэваапрацоўчы камбінат—нова-пабудаванае прадпрыемства. Асваеньне праектнай магутнасьці па камбінаце ідзе нездавальняюча. Ня ўсе ячэйкі цэхі аўладалі новай тэхнікай і здолелі правільна, выразна і добра наладзіць вытворчасьць.

Тыя сотні прапаноў, якія сабраны на камбінаце, зьяўляюцца вялікім вагаром выкананьня і перавыкананьня вытворчай праграмы прадпрыемства. Пытаньне ня толькі ў аднэй эканоміі, якую можа даць рэалізацыя рабочых прапаноў. Яны зьяўляюцца перш за ўсё фактам буйнага палітычнага значэньня, паказальнікам росту сацыялістычных адносін да працы з боку рабочых камбінату, іх гатоўнасьці аддаць свае сілы на барацьбу за лепшую бальшавіцкую работу свайго сацыялістычнага прадпрыемства.

Тым больш ганебным і недапушчальным зьяўляецца ўсякае ігнараваньне рабочай ініцыятывы. Тым больш суровы адпор павінна сустракаць найменшая спроба затармазіць рост рабочага вынаходзтва.

Газэта «За бальшавіцкія перамогі», пачаўшы вялікую справу, дабіўшыся першых посьпехаў, хутка апусьціла рукі і моцна заснула на баявым пасту...

Ня так паступае **«Сельмашац»** — газэта Гомсельмашу. Рэдакцыя «Сельмашца» змагаецца ня толькі за адны лічбы, за адну колькасьць рабочых прапаноў. Яе работа—поўная процілеглась рабоце газэты «За бальшавіцкія перамогі».

У адказ на адозву ленінградзкіх рабочых, Гомсельмаш прыняў канкрэтныя абавязацельствы па выкананьні сваёй вытворчай праграмы. У прыватнасьці, гомсельмашаўцы далі слова

«...САБРАЦЬ У ФОНД 15-й ГАДАВІНЫ КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ НЯ МЕНШ 300 РАБОЧЫХ ПРАПАНОЎ, АСАБЛІВА ПА НОВАЙ МАШЫНЕ «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ».

На дрэваапрацоўчым камбінаце таксама давалі слова. Кляліся, запэўнялі, абяцалі. Калі-ж справа дайшла да практычнай работы, усе абяцаньні былі хутка забыты. «Сельмашац» не абмяжоўваецца адным лёзунгам—сабраць 300 рабочых прапаноў. Газэта адразу [illegible] шырокую праверку выкананьня. Збор прапаноў спалучаецца са штодзённай і дзейснай барацьбой за хутчэйшае ажыцьцяўленьне кожнай прынятай вытворчай прапановы.

У газэце зьмяшчаюцца «тэмы для рабочага вынаходзтва». Ня думайце, што гэта проста пейкая казённая рэгламантацыя вынаходзкай мысьлі, штучнае абмежаваньне творчай ініцыятывы рабочых. Далёка не. Гэта—дзелавая, практычная дапамога, інструктаж, карыснае ўказаньне для кожнага рабочага на чым трэба згрупаваць асаблівую ўвагу.

Газэта бярэ кожны цэх Гомсельмашу і паказвае слабыя бакі арганізацыі вытворчых працэсаў, заклікае ўсіх рабочых падумаць, якім чынам можна ўдасканаліць работу поўнага варштату, намазгаваць, якімі шляхам, якім мэтадам зьяшчыць той ці іншы вытворны недахоп. На старонках «Сельмашца» дзеўца 85 такіх тэм, якія [illegible] працаваць работу ўсіх цэхаў Гомсельмашу. Рэдакцыя заклікае кожнага рабочага

«...ВЫБРАЦЬ САБЕ ТЭМУ І РАСПРАЦАВАЦЬ ЯЕ».

Заклік дасягае мэты. Тэмы для вынаходзтва рушаць наперад рабочую мысьль, дапамагаюць ёй разьвіць і вырашыць на справе, праверыць на вопыце тое ці іншае вытворчае пытаньне.

Тав. Шэйн—рабочы лёгка-кацельнага цэху вынайшоў спосаб поўнай ліквідацыі браку. Прапанова т. Шэйна дае эканоміі на 2.000 руб. Тав. Брадоўскі—рабочы таго-ж цэху прапанаваў новы мэтад клёпкі дэфлектара, што таксама з'эканоміць заводу по адну тысячу рублёў і палепшыць якасьць прадукцыі. Такіх прыкладаў на старонках «Сельмашца» можна знайсьці нямала.

Газэта «За бальшавіцкія перамогі» пры зборы рабочых прапаноў цікавілася толькі тэй прапановай, якая была разгледжана і ўхвалена. Не адзін дзесятак рабочых прапаноў на камбінаце атрымаў лёканічны і беспаваротны прыгавор: «не падыходзіць». Чаму, з-за якіх прычын? Невядома. Газэта не цікавілася, як праходзіць разгляд прапаноў, не прасачыла, ці няма тут фактаў бюракратычных, бяздушных адносін да рабочага вынаходцы. Інакш робіць «Сельмашац». Газэта ўказвае на выпадкі, калі прапановы адхіляліся толькі таму, што аўтар ня мог добра выказаць сваёй думкі, зрабіць дакладны чарцёж, хоць сама ён сабе яго прапанова і была правільнай і каштоўнай. Патрабаваньне «Сельмашца»:

«Дапамагаць аўтару тэхнічна распрацаваць яго думку, даць напрамак у далейшай рабоце».

Газэта бярэ над суровы абстрэл работу заводзкага бюро рабочага вынаходзтва, сочыць за лёсам кожнай рабочай прапановы, выкрывае людзей, якія не жадаюць «адкрыць сэмафоры для творчай ініцыятывы рабочых».

Ніякай абязьлічкі ў сваёй крытыцы рэдакцыя не дапускае. І калі прапанову рабочага фамонтна-інструмантальнага цэху т. Фёдарава на Гомсельмашы пачалі марыць, пік «Сельмашац» не патрабуе, як газэта «За бальшавіцкія перамогі», толькі аднэй «большай адказнасьці». Газэта не займаецца аліўўйскімі заклінаньнямі, а суровa і заслужана б'е па канкрэтных посьпітах зла.

***

Дзьве газэты—два падыходы да аднэй і тэй-жа справы. Адна толькі рэгіструе факты, другая па-баявому арганізуе рабочую ініцыятыву па барацьбу за тэмпы і якасьць выкананьня прамфінпляну. Пара, даўно пара газэце «За бальшавіцкія перамогі» пайсьці па шляху газэты «Сельмашац»!

Куставая нарада рэдактароў і агітмасаў па збожжазагатоўках адбудзецца сёньня ў 12 гадз. дня ў памяшканьні ЦК (Агітмас).

ЦК КП(б)Б.

Кожэмякіна», «Дело Артамоновых» і асабліва «Жизнь Клима Самгина» — Горкі ўсебакова ўскрываючы працэс фармаваньня расійскага капіталізму, фармаваньня абслугоўваючай яго інтэлігенцыі, выкрывае гістарычныя карэньні шэнальнія буржуазіі да відзелкі з царызмам самост барацьбы з ім, прасочвае глыбокія гістарычныя карэньні шкодніцтва Рамізіных, дапамагае ўсьвядоміць шлях расійскага меншавізму аж да яго працэсу перад судом дыктатуры пралетарыяту, працэсу, які выкрыў усе сувязі меншавізму з расійскім і міжнародным капіталізмам.

Гэтай глыбінёй паказу гістарычнай памінучасьці надсенных царызму і капіталізму, дробна-гістарычных карэньняў рамізіннага і меншавізму, творчасьць Горкага актуальная, надзеенная, зьяўлялася і зьяўляецца магутнай зброяй у клясавай барацьбе расійскага і міжнароднага рабочага руху.

ЗА ЛЕНІНСКУЮ АЦЭНКУ ТВОРЧАСЬЦІ ГОРКАГА

Творчы шлях Горкага ў аснове сваёй — шлях пралетарскага мастака. М. Горкі працаваў вялікую работу для рабочага руху. Ён паказаў рабочым з усёй сілай таленту гнілясьць царскага і капіталістычнага ладу, узброіў пралетараў ведамі аб іх клясавым ворагу, дапамог ім глыбей усьвядоміць супярочасьці паміж клясамі.

«Няма сумненьня, што Горкі — вялізарны мастацкі талент, які прынёс і прыносе шмат карысьці сусьветнаму пралетарскаму руху» (Ленін).

Ленінская ацэнка аснавана на ўсебаковым уліку сувязей творчасьці Горкага з гісторыяй барацьбы рабочае клясы па разуменьні, па ўменьні вылучыць з гэтых сувязей аснову нае і рашаючае.

Творчасьць Горкага адлюстравала і сілу ўздыму рабочага руху і труднасьці працэсу вызваленьня рабочае клясы.

Ворагам рабочае клясы хацелася ўчапіцца за слабыя бакі творчасьці Горкага, якія перамагаў Горкі сам, апіраючыся на тое, што яго творчасьць была ў аснове творчасьцю рабочае клясы.

Вось чаму Ленін, не закрываючы вачэй на памылкі, крытыкаваў іх у парадку «сама крытыкі», у парадку ідэйна-выхаваўчай работы [illegible] Ленін а Горкім ар[illegible] ім), [illegible] пралетарскую мастацку [illegible] ня-гістарычным падыходзе да [illegible] ацэнка аснавана на дыялектычным [illegible] перакапаньнем, растлумачэньнем вызваліцца ад чужых уплываў, але ніколі Ленін не аддаваў М. Горкага ворагам.

У 1909 годзе, калі разрыў бальшавікоў з Багданавым нарадзіў шмат чутак у буржуазным друку аб адносінах паміж бальшавікамі і Горкім, Ленін заявіў у газэце «Пролетарий», што гэта «байка буржуазнага друку аб выключэньні Горкага». Ленін, выкрываючы мохэмізм буржуазнай прэсы, паказаў крыніцы і мэту плёткарскай кампаніі.

«Крыніца гэтых плётак ясная: які-небудзь борзапісец, пачуўшы гораем вуха аб газгалосьсях у сувязі з адзавізмам і «богостроительством», бязбожна перабалтаў адрыўкі вестак і «слаўна зарабіў» на выдуманых «літарв'ю» і г. д.

Мэта паклёпніцкай кампаніі ня менш ясная. Буржуазным партыям **хочацца,** каб Горкі выпаў з сацыял-дэмакратычнай партыі. Буржуазныя газэты са скуры лезуць, каб расшаліць ракгалосьсі ўпутры, сацыял-дэмакратычнай партыі і прадставіць іх у перакручаным выглядзе. Дарэмна стараюцца буржуазныя газэты. **Таварыш Горкі занадта моцна зьвязаў сябе сваімі вялікімі мастацкімі творамі з рабочым рухам Расіі і ўсяго сьвету, каб адказаць ім ня інакш, як пагардай» (Ленін т. XI, ч. 1, стар. 360).**

Ленін, як бачым, устанаўляе сувязь вялікіх мастацкіх твораў з рэвалюцыйным рабочым рухам, не замыкае, не абасабляе, а бярэ мастацкую творчасьць Горкага як адзін з бакоў, як адну за зброй барацьбы рабочае клясы. Для Леніна магутнасьць гэтых сувязей куды больш моцная і істотная ў Горкім, чым моманты часовага аслабленьня і ўпадкаў у творчасьці Горкага. Ленін ня ўзводзіць часовага і пераходнага ў асноўную накіраванасьць творчасьці Горкага.

У 1910 годзе Ленін зноў заяўляе:

«Горкі — безумоўна найбуйнейшы прадстаўнік **пралетарскага** (падкрэслена Леніным) мастацтва, які шмат для яго зрабіў і яшчэ больш можа зрабіць... Горкі — аўтарытэт у справе пралетарскага мастацтва, гэта бясспрэчна. У справе пралетарскага мастацтва М. Горкі ёсьць вялізарны **плюс,** ня гледзячы на яго спачуваньне махізму і адзавізму».

[illegible] ацэнка аснавана на дыялектычна-гістарычным падыходзе да [illegible] мастацкіх твораў Горкага. Ленін выкрывае антыдыялектычны характар аўтараў «плядформы» прыхільнікаў і абаронцаў адзавізму, якія стараліся «замацаваць і скарыстаць якраз тое, што складае слабы бок, што ўваходзіць адноўнай вялічынёй у суму вялізарнай карысьці, што трыпосіцца іх пралетарыяту».

Ленін быў упэўнен, што Горкі здолее перамагчы свае слабыя бакі. Гэта ўпэўненасьць грунтавалася на тым, што творчасьць Горкага ў сваёй аснове — балвэя творчасьць рабочае клясы.

Сваёй пераніскай Ленін дапамагае яму перамагчы слабыя бакі, падобна таму, як у адносінах да асобных пластоў рабочых, якія надпадалі, або яшчэ канчаткова не пакончылі з чужым уплывам, Ленін змагаецца за вызваленьне іх ад памылковых думак, дапамагае ім стаць на правільныя пазыцыі.

У 1917 годзе Ленін, крытыкуючы памылковыя погляды Горкага, так ускрывае канкрэтна гістарычныя карэньні іх:

«Ліст Горкага выказвае надзвычай распаўсюджаныя забабоны ня толькі дробнай буржуазіі, але і часткі рабочых, якія знаходзяцца пад яе ўплывам. Усе сілы нашай партыі, усе намаганьні сьвядомых рабочых павінны быць накіраваны на ўпартую, настойлівую, усебаковую барацьбу з гэтымі забабонамі» (Ленін, т. XX, стар. 41).

Але ўпэўненасьць у Горкім, як пралетарскім мастаку і тут у 1917 г. не пакідае Леніна.

«Няма сумненьняў, што Горкі — вялізарны мастацкі талент, які прынёс і прыносе шмат карысьці сусьветнаму пралетарскаму руху».

Ясна, што гэта ацэнка Леніна зноў-такі абгрунтавана на тым, што ў творчасьці Горкага асноўныя, рашаючыя сувязі — гэта сувязі з рабочаю клясай.

Творчы шлях Горкага апошніх год, яго актыўны ўдзел у клясавай барацьбе, у сацыялістычным будаўніцтве, повае цкаваньне яго з боку капіталізму — бліскуча пацьвярджалі ленінскі аналіз і ацэнку творчасьці М. Горкага.

Адмаўленьне пралетарскага характару творчасьці Горкага гаворыць аб рэвізіі Леніна, аб няўменьні зразумець і аўладаць марксыцка-ленінскай рэвалюцыйнай дыялектыкай няўменьні браць мастацкую творчасьць у рашаючых сувязях з канкрэтнымі клясамі, якія ядуць клясавую барацьбу. Барацьба за ленінізм ў літаратуры, барацьба з мэханістычнай мэтадалёгіяй як галоўнай любясьпекай, барацьба з меншавіцтвуючым ідэалізмам дэборынскай групы, барацьба з «лефаўшчынай», «літфронтаўшчынай» патрабуе і ў літаратурнай крытыцы, выкрыцьця клясавароржай рэвізіі ленінскай ацэнкі Горкага.

Плеханоў у сваім разгледзе творчасьці Горкага рэзка нападаў на бальшавіцкую тактыку, высьмейваў яе як «рэвалюцыйную альхэмію, лічыў тактыку бальшавікоў праяўленьнем уплыву рэвалюцыянэраў-інтэлігентаў, выхадцаў з буржуазнага асяродзішча. Але Плеханаў у сваім разгледзе п'есы «Враги», паставіўшы задачай абарону **пэўнай** тактыкі, ня ставіць перад сабой пытаньня — ці адпавядае і паколькі адпавядае горкаўскі паказ змаганьня клясаў аб'ектыўнай фасстаноўцы клясавых сіл у царскай Расіі ў буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі.

Ад гістарычнай пастаноўкі пытаньня, ад канкрэтнага аналізу — ці паказаны Горкім **істотныя рашаючыя** бакі сапраўднасьці, г. зн. пэўнага грамадзтва з пэўнымі клясамі,— Плеханаў уходзіць у разважаньні «наогул» і з повяду.

Характэрна, што Плеханаў прабуе паказаць ісыхалёгію рабочага руху, ак абгрунтаваньне сваёй меншавіцкай тактыкі — з разгляду вобразаў рабочых п'есы «Враги», бяручы іх **ізаляваны, адарваны** ад вобразаў капіталістаў, паказаных Горкім, не прасочваючы, якія погляды адстойвае сам Горкі.

Гэты ізаляваны адпабаковы разгляд вобразаў рабочых быў патрэбен Плеханаву, каб упікнуць канкрэтнай пастаноўкі пытаньня аб характары і скаласаблівасьці расійскай буржуазіі, бо ўрокі барацьбы з ёю яўна пацьвярджалі ленінскую тактыку.

Апавяданьне «Мать», якое дало мастацкае абагуленьне рухаючых сіл рэвалюцыі 1905 г., заклікала да рашучай і арганізаванай барацьбы з капіталізмам і з царызмам, а по да зьдзелак з лібэраламі (як гэта адстойваў Плеханаў) — таму і сустрэла рэзка адноўную ацэнку Плеханава.

Нічога агульнага з ленінскай дыялектыкай няма і ў рэбоце Гарбова аб Горкім. Гарбоў лічыць Горкага пралетарскім пісьменьнікам, але паказваючым падсьвядомыя працэсы ў рабочай клясе, выключна адсталасьць рабочага руху. Тэарэтык варошчыны бачыць сілу Горкага ня ў сувязі з рабочай клясай і яе рэвалюцыйнай барацьбой, а ў тым, што ён быццам уступае ў канфлікт са сваёй клясай.

Мэханістычная мэтадалёгія і меншавіцкая ацэнка творчасьці Горкага дана ў Перавярзева, у Грыгор'ява, Кубікава, Бяспалава. Супярэчыць Леніну пастаноўка Нусінава, што Горкі прышоў у літаратуру як пісьменьнік узьнятых пралетарыятам мас, як «пісьменьнік дэклясаванага мяшчаньства і рамесьнікаў, як пісьменьнік люмпэн-пралетарыяту». Але падрабязны разгляд крытыкі аб Горкім — гэта тэма асобнай работы. Толькі выходзячы з ленінскіх ацэнак творчасьці Горкага, у барацьбе з меншавіцкімі, антыленінскімі тэорыямі і ацэнкамі можна правільна вывучыць творчы шлях Горкага.

***

У перапісцы Леніна з Горкім ёсьць яшчэ адзін бок, вельмі важны. Гэта — ленінскія адносіны да значэньня вялікай мастацкай літаратуры і выказваньні з повяду спалучэньня творчай работы пісьменьніка з удзелам у газэце.

Ленін надаваў вялікае значэньне ўдзелу Горкага ў бальшавіцкім друку. Ленін зварачаецца да Горкага з прапановай супрацоўнічаць у «Правде» і ў бальшавіцкіх часопісах.

Мы ведаем, што Горкі змог спалучыць работу па стварэньні вялікіх мастацкіх палотнаў з актыўным штодзённым удзелам у газэце.

Нярэдка прыходзіцца чуць ад пачынаючых пралетарскіх пісьменьнікаў скаргу, што работа ў бальшавіцкім друку, або партыйная і грамадзкая нагрузка перашкаджаюць іх творчаму росту. Тут карысна прывесьці палеміку Горкага з адным з пачынаючых пісьменьнікаў. Горкі піша:

«... Да рэчы будзе адказаць на нараканьні некаторых пачынаючых пісьменьнікаў, асабліва на падрабязны ліст аднаго з іх. Паведамляючы аб сваім цяжкім становішчы,—жонка, сын, хутка будзе другі», а галоўнае «нагрузка грамадзкай работы», ён сьцьвярджае, што «творчасьць толькі тады можа дасягнуць максымальнага результату, калі чалавек адчувае сябе выключна літаратарам, як адчувае сябе ны», г. зн. Горкі. Горкі пярэчыць: «Асабіста я ніколі не адчуваў і не адчуваю сябе «выключна літаратарам», усё жыцьцё займаўся ў тэй ці іншай галіне грамадзкай дзейнасьці, і да гэтага дня на страціў цягі да яе. Маладыя літаратары часта скардзяцца, што дробязная грамадзкая дзейнасьць пагнэтае вельмі многа часу і парушае творчую работу мысьлі» і г. д. Скаргі гэтыя я лічу неабгрунтаванымі» (Горкі. «Лит. учеба» № 7, стар. 11).

Іменна дзякуючы таму, што творчы шлях Горкага ня быў замкнуты, а цесна сплятаўся з лёсам рабочае клясы, пісьменьніку ўдалося стварыць такія мастацкія творы, якія адыгрывалі і будуць адыгрываць выдатную ролю ў барацьбе рабочай клясы з капіталізмам, у справе сацыялістычнага будаўніцтва.

Ленін у 1913 годзе пасьля царскай літаратарскай амністыі, задумваючыся аб магчымасьці звароту Горкага ў Расію, пісаў:

«А рэвалюцыйнэму пісьменьніку магчымасьць павалюцыяніцца па Расіі (на повай Расіі) азначае магчымасьць у сто раз больш ударыць потым Раманавых і К°...»

Расія Раманавых і К° даўно зьнішчана. Мы будуем сацыялізм, мы ўступаем у палосу непасрэднага будаўніцтва бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва. Але бай з рэшткамі клясавых ворагаў, якія акапаліся ўпутры СССР, бай з міжнародным капіталам ня сьціхаюць, а нарастаюць. Нам прадстаяць яшчэ жорсткія бойкі. Але калі ў гады перад рэвалюцыяй 1905 году і перад 1917 г. у рабочай клясы былі адзінкі, дзесяткі пралетарскіх пісьменьнікаў, то зараз савецкая літаратура мае ў сваіх радах сотні пісьменьнікаў. У літаратуру ідуць тысячы рабочых-ударнікаў, ударніц, калгасьнікаў, лепшыя, адданыя пралетарыяту сілы інтэлігенцыі і няма сумненьня, што ў бліжэйшы час разам з Горкім, пад кіраўніцтвам ленінскай партыі, рабочая кляса СССР і ўсяго сьвету выхае кадры такіх пісьменьнікаў, створыць такую баявую мастацкую літаратуру, якая яшчэ мацней, яшчэ больш магутна будзе на сусьветным капітале і яго кампаніі сацыяліст і нацыянал-фашыстах трацкістах і апартуністах усіх масьцей.

Беларускія гімназіі у Зах. Беларусі ліквідаваны канчаткова

Цяпер ужо афіцыяльна сьцьверджана: беларускіх гімназій няма—**яны ліквідаваны.** Замест іх існуюць беларускія філіі пры польскіх дзяржаўных гімназіях у Вільні і Наваградку. Польскі фашызм зрабіў новы крок па шляху палёнізацыі Заходняй Беларусі.

У ліквідаваныя беларускія гімназіі, ня гледзячы на тое, што ў іх гаспадарылі верныя саюзнікі акупантаў — Луцкевічы і Астроўскія, трапілялі хоць і нязначныя групы беларускай працоўнай моладзі. Гэта ўносіла ў школы рэвалюцыйны дух нацыянальна-вызвалеўчай барацьбы, што ні ў якай меры не магло задаволіць акупантаў.

Таму польскі фашызм палічыў мэтавугодным спыніць існаваньне беларускіх гімназій і стварыць беларускія філіі пры дзьвёх польскіх гімназіях, бяручы такім чынам поўнасьцю ў свае рукі кантроль пад **сацыяльным** складам вучнёўскай моладзі і яе жыцьцём.

Можна быць упэўненым, што ў гэтыя «беларускія» філіі атрымаюць доступ толькі дзеці беларускай гарадзкой буржуазіі і кулацтва. Працоўнай моладзі, «элемэнтам сацыяльна-прычечаным» (акрэсьленьне віленскага куратара пана Шэлянгоўскага) —шляхі да навукі будуць **адрэзаны.**

Новы палёнізатарскі ход польскага фашызму зроблен **пры поўным падтрыманьні і садзейнасьці нацыянал-фашысцкай групы Луцкевіча—Астроўскага,** якая ўсё больш скочваецца да ролі простага выканаўцы даручэньняў акупанта. Пад «апазыцыйны» шумок «Беларускага Звону» Астроўскі **складаў і рэдагаваў** праект ліквідацыі беларускіх гімназій і стварэньня беларускіх філій пры польскіх гімназіях, праект, **палёнізатарскі** характар якога відавочны да пагласьці.

Апошнім акордам «апазыцыйнасьці» Цэнтрасаюзу ў справе ліквідацыі беларускіх гімназій было назначэньне **кіраўніком** беларускай філіі польскай гімназіі імя Славацкага ў Вільні нацыянал-фашысцкага лідэра **Астроўскага,** якога «Кур'ер Віленскі» з такім гонарам называе «цьвяроза думаючым беларусам».

Пасьля палёнізатарскай «апэрацыі», як закончанага факту, луцкевічаўскі **«Беларускі Звон»** вышаў з артыкулам «Гімназіі будуць жыць!». Як подла гэта тучыць перад тварам факту: **«гімназій няма».** Для органу нацыянал-здрады ўся гэта справа зводзіцца толькі да пытаньня **формы:** гімназіі, бачыце, існаваць будуць, а форма — гэта глупства.

Аднак па гэтым цынізм нацыянал-прахвостаў ня спыніўся. Той-жа нумар «Беларускага Звону», побач з артыкулам «Гімназіі будуць жыць!», зьмяшчае перадавіцу, у якой вітае «беларускую працоўную моладзь», якая адзе вучыцца:

«Не на забаву едзе наша моладзь улетку на вёску... Едзе яна туды—пасьля галадухі і ўмысловае працы ў школе на працягу ўсяе зімы — на такую-ж галадуху і фізычную працу ў хаце.

...Мы вітаем нашу беларускую ПРАЦОЎНУЮ моладзь.

... Ці шмат мазалёў нагулялі вы, робячы ў полі, памагаючы бацьком? Ці мелі часіны адпачынку і весельля? І ці КОЖНЫ ДЗЕНЬ БЫЛІ ВЫ СЫТЫЯ?».

Так нацыянал-фашысцкія дэмагогі спэкулююць на нядолі, на голадзе беларускай працоўнай моладзі, так агідна і так цынічна! Мімаволі чуецца адказ гэтай самай абязздоленай беларускай моладзі, гэтых маладых рабочых і сялян: «Пане Астроўскі, подлы нацыянал-здраднік і кат рэвалюцыйнай вучнёўскай моладзі, той самы, які пасылаў нас у турмы! Скажы, герой «чорнай кавы», дарагі госьць Кіртыклісаў, Бачковічаў і Жылгоўскіх,—колькі юдавых срэбнікаў атрымаў ты за тое, што нас, галодных, пазбавіў нават гэтай мізэрнай магчымасьці вучыцца?! Скажы, повасьпечаны кіраўнік «беларускай філіі», колькі злотых ты атры маў за вывешаную на дзьвярох былой гімназіі абвестку: «элемэнтам сацыяльна-прыгнечаным уваход сурова забараняецца?!».

Але паны нацыянал-здраднікі груба памыляюцца, калі думаюць, што беларускія працоўныя масы будуць пасыўна чакаць, пакуль нехта дасьць ім родныя школы, што яны будуць «змагацца», седзячы з лемантаром у руках дома так, як ім раяць «Званы» і «Крыніцы».

Груба памыляюцца таксама і родныя браты Луцкевіча—беларускія нацыянал-фашысты з-пад сьцягу Хрысьціянскай Дэмакратыі, калі думаюць нажыць палітычны капітальчык на ганебнай здрадзе «Цэнтрасаюзу», прыкідваючыся такімі заядлымі «абаронцамі» ліквідаваных гімназій *).

Ніхто іншы, як беларускія хадэкі супольна з «цэнтрасаюзнікамі» дапамаглі акупантам уварвацца ў справы гімназій пад відам «барацьбы з камунізмам» і нарэшце канчаткова ўзяць яе ў свае рукі і задушыць. **І хадэцыя, як і «Цэнтрасаюз», у такой самай меры зьяўляецца здраднікамі нацыянальнага вызваленьня беларускага народу.**

Гэта дасканала ведаюць рабочыя і сяляне Заходняй Беларусі. Яны пад кіраўніцтвам КПЗБ **актыўна** змагаліся і надалей будуць змагацца супроць кожнага праяўленьня палёнізатарскай палітыкі акупантаў, супроць **дапаможніка** гэтай палітыкі—беларускага нацыянал-фашызму як хадэцкай, так і «цэнтрасаюзнай» фірмы. Пры гэтым беларускія рабочыя і сяляне ведаюць, што барацьба за школу на роднай мове ёсьць **частка** агульнай рэвалюцыйнай барацьбы супроць акупантаў.

В. Тарскі.

*) **«Беларуская крыніца»** 20 верасьня выступіла з перадавым артыкулам «На пахілай дарожцы», у якім дэмагагічна «абараецца» здрадай групы Луцкевіча—Астроўскага.

Адозва ўсегерманскага камітэту рэвалюцыйнай прафапазыцыі

БЭРЛІН, 23. Усегерманскі камітэт рэвалюцыйнай прафапазыцыі апублікаваў адозву да ўсіх членаў прафсаюзаў. У адозьве ўказваецца, што ўрад пачаў генэральнае наступленьне на рабочых і беспрацоўных, скарачаючы і без таго мізэрную зарплату і дапамогі па бе[illegible]працоўі. Прадпрыемцы спадзяюцца, што згодам з прафбюрократамі [illegible] ўдасца сарваць аб'яднаную барацьбу рабочых.

Адозва заклікае рабочых да барацьбы адзіным фронтам супроць зьніжэньня зарплаты, скарачэньня дапамогі, супроць фашызму.

Новыя дакыя аб інтэрвэнцыі ў Сібіры

МЭМУАРЫ ГЕНЭРАЛА МАРЧА

НЮ-ЁРК. Генэрал **Пейтон Марч,** былы начальнік генэральнага штабу Злучаных Штатаў у часы імпэрыялістычнай вайны, у апублікаванай кнізе сваіх мэмуараў «Нацыя ў вайне» падае **новыя падрабязнасьці, якія адносяцца да інтэрвэнцыі ПАЗШ у Сібіры і ў Архангельску.**

У сувязі з прапановай Англіі аб японскай інтэрвэнцыі ў Сібіры, Марч публікуе ліст генэрала **Бліса** (ваенны прадстаўнік Амэрыкі ва Францыі) ад 20 лютага 1918 г., у якім гаворыцца: «Гэта пытаньне, зьвязанае з вялізарнай адказнасьцю. **Інтэрвэнцыя буйнай японскай арміі на тэрыторыі, якая складае значную частку Сібіры, выклікае пытаньне—калі і якім чынам гэту армію можна будзе прымусіць адыйсьці адтуль. Я часта думаў, што гэта вайна замест таго, каб быць апошняй вайной, можа толькі выклікаць новыя войны. Гэта інтэрвэнцыя Японіі выклікае мысьль аб магчымасьці выбуху новай вайны».**

24 чэрвеня 1918 г. Марч пісаў Вільсону: **«З пункту гледжаньня інтарэсаў Злучаных Штатаў** вырашэньне расійскага пытаньня шляхам **прадастаўленьня Японіі часткі Сібіры** ў якасьці ўплаты за яе ўдзел у інтэрвэнцыі **зусім не дапушчальна** з амэрыканскага пункту гледжаньня». Часова Вільсон як быццам згадзіўся з поглядамі, якія выказваюцца Марчам, але 6 ліпеня ён аддаў загад аб удзеле амэрыканскіх ваенных часьцей у інтэрвэнцыі ў Сібіры, пры ўмове згоды Японіі на абмежаваньне яе войск у разьмеры 7 тыс. чалавек.

«Я здзівіў,—піша Марч,—вайсковаму міністру, што лічу такую згоду бескарыснай, бо **ў ваенную праграму Японіі ўваходзіць экспансія на азіяцкім матэрыку. Як толькі яна атрымае права ўводу сваіх войск у Сібір, яна ня будзе лічыцца з абмежаваньнем колькасьці войск у 7 тыс., распаўсюдзіцца на Ўсходнюю Сібір і тады будзе вельмі цяжка выгнаць яе адтуль».**

«У рэзультаце,—піша далей Марч,—як толькі скончылася сібірская экспэдыцыя, маё прадраканьне апраўдалася. Генэрал Грэвс у сваім першым дакладзе паведамляў, што **японскія войскі ў Сібіры складаюць 60 тыс. чалавек, пазьней гэта лічба дасягнула 72 тыс.».**

Марч пярэчыў таксама супроць інтэрвэнцыі ў Архангельску, але Англіі ўдалося дабіцца згоды Вільсона.

Правал канфэрэнцыі ў Стрэзе

РЫМ. Як і трэба было чакаць, канфэрэнцыя ў Стрэзе скончылася **поўным правалам.**

На заключным пасяджэньні канфэрэнцыі **Адысон** заявіў, што **Англія,** з прычыны сваёй эканамічнай палітыкі, ня ў стане ні **прадастаўляць прэфэрэнцый, ні аказаць фінансавую дапамогу** краінам цэнтральнай і ўсходняй Эўропы.

Галяндзкія і бэльгійскія дэлегаты ўстрымаліся ад прыняцьця пастаноў канфэрэнцыі, заявіўшы, што яны павінны папярэдня паведаміць аб іх сваім урадам.

Прадстаўнікі **Чэха-Славакіі і Аўстрыі** заявілі, што яны ня могуць прымаць удзелу ў аказаньні фінансавай дапамогі аграрным краінам.

Італьянскі дэлегат дэ-Мікеліс указаў, што **пастановы канфэрэнцыі не абавязваюць італьянскага ўраду.**

Прадстаўнік Германіі **Посе** ўказаў, што **Германія ня можа аказаць фінансавай дапамогі цэнтральнай і ўсходняй Эўропе** і што, паводле яго думкі, адзіным мэтадам ажыцьцяўленьня рэвалёрызацыі зборжка зьяўляюцца двухбаковыя прэфэрэнцыяльныя згоды, якія прадугледжваюць сустрэчныя кампэнсацыі.

Толькі старшыня французкай дэлегацыі Бонэ заявіў, што ён упаўнаважан французскім урадам прыняць пастановы канфэрэнцыі поўнасьцю.

Газэты трэсту „Скрыпс Говард" аб савецка-амэрыканскіх адносінах

НЮ-ЁРК, 23. Пераважны артыкул газэты трэсту «Скрыпс Говард», камэнтуючы рад эзнак ажыцьцяўленьня эканамічных адносін СССР з некаторымі краінамі, у прыватнасьці паведамленьне аб пакупцы Францыяй і Японіяй савецкай нафты, заяўляе:

«Гэтыя факты ў палітычных і эканамічных адносінах маюць вялікае значэньне для Злучаных Штатаў. Эканамічна яны азначаюць, што іншыя краіны будуць працаваць у СССР тавары, якія Савецкі саюз мог-бы купіць у ПАЗШ. У лепшыя для нас часы Савецкі саюз меў патрэбу ў нас, **а зараз мы маем патрэбу ў СССР.** Пры скарачэньні вытворчасьці і поўнай адсутнасьці чужаземных заказаў Злучаныя Штаты ня могуць адмовіцца ад савецкага рынку. Савецкі саюз можа заваяваць нафтавыя рынкі, на якіх раней панавалі амэрыканцы, што нанясе цяжкі ўдар па амэрыканскай нафтавай прамысловасьці. Калі-б мы мелі дыплёматычныя зносіны з Масквой, было-б лёгка ўстанавіць долю гандлю з СССР, але Вашынгтон глухі і нямы.

У палітычных адносінах паказаныя факты больш зрывожныя. Японія адкрыта рыхтуецца да вайны. Токіё даўно імкнецца зрабіць свой флёт незалежным ад закупкі амэрыканскай нафты. Англія і Францыя яўна адмовіліся ад дагавору, які гарантуе незалежнасьць Кітаю. СССР наздварот зацікаўлен у захаваньні міру».

ЯПОНСКАЯ НОТА ЛІЗЕ НАЦЫЙ

ЖЭНЭВА. 19 верасьня была апублікавана нота японскай дэлегацыі ў Лізе нацый за подпісам **Матсуока.** Нота адрасавана на імя старшыні Рады лігі і да яе прыкладзены «для інфармацыі» тэксты пратаколу, падпісанага Японіяй і Манчжурскай дзяржавай, дэкларацыя японскага ўраду ад 15 верасьня і прамова **Уцыда** на апошняй сэсіі японскага парляменту.

Адначасова апублікаван ліст кітайскага дэлегата **Яня** на імя старшыні чарговага пленуму Лігі нацый. Янь абвінавачвае Японію «**у прызнаньні ў Кітаі адкрытай і бязупынной палітыкі гвалту і інтрыг, накіраванай да аддзяленьня трох усходніх провінцый Кітаю і да [illegible] фактычнага пратэктарату над Манчжуріяй, шляхам** [illegible] **«кукольным» манчжурскім урадам. Гэты пратэктарат — першы крок па шляху да анэксіі Манчжуріі, накшталт анэксіі Карэі».**

Цытуючы прамову **Стымсона** ад 5 жніўня Янь заўважае, што Японія, прызнаўшы манчжурскі ўрад, завяршыла сваю палітыку парушэньня дагавору 9-ці дзяржаў, пакту Кэлёга і статуту Лігі нацый. Японія фактычна адхіліла даклад камісіі Літона яшчэ да яго абгаварэньня ў радзе Лігі нацый.

Выказваючы пэ-ранейшаму «татоўнасьць абгаварыць пытаньне аб праўільным вырашэньні канфлікту», Янь заяўляе ад імя нанкінскага ўраду, што пастаў час абгаварыць пытаньне, якія крокі павінны быць прадпрыняты Лігай нацый для захаваньня сьвятасьці дагавораў».

Народзе вестак даклад **Літона** прыбудзе ў Жэнэву да 25 верасьня. Да таго-ж часу ў Токіё і Нанкіне будуць ужываны японскаму і кітайскаму ўрадам экзэмпляры гэтага даладу разам з дадаткамі. Даклад з дадаткамі займае каля 1.000 старонак.

Патрабаваньне Японіі аб адтэрмінаваньні абгаварэньня дакладу Літона на 6 тыдняў, як відаць, будзе задаволена. Таму чакаюць, што надзвычайны пленум Лігі зьбярэцца ў другой палове пістапада або нават у пачатку сынежня.

Урокі аўчына-футравога заводу павінны ўлічыць усе прадпрыемствы БССР

Ліпеньскі аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б абавязаў партыйныя, прафсаюзныя і гаспадарчыя арганізацыі разгарнуць работу па выпуску прадметаў шырокага спажываньня. **Гэта ўказаньне зьяўляецца важнейшай умовай для стымуляваньня калгасьнікаў і працоўных сялян аднаасобнікаў на справу разгортваньня гандлю прадуктамі сельскай гаспадаркі.**

Разгарнуць таваразварот, выпусьціць больш тавараў шырокага спажыву, накіраваць іх пасустрач прадуктам сельскай гаспадаркі — такава задача сёньняшняга дня. Хто не разумее гэтай задачы, той дробна-буржуазны перараджэнец, ён зрывае палітычнае матар яльнага дабрабыту працоўнага насельніцтва нашай краіны.

Толькі апартуністы гомельскага аўчына-футравага заводу **«ПРАЛЕТАРСКІ ШЛЯХ»** не разумеюць ці ня хочуць зразумець задач, пастаўленых партыяй і ўрадам аб «савецкім гандлі і выпуску шырокага спажыву». Яны толькі **17 ліпеня** арганізавалі уцільцэх. Але работа па мабілізацыі мас па выкананьне вытворчай праграмы адсутнічала. Гэта прывяло да таго, што за ліпень месяц уцільцэх сваё заданьне выканаў усяго **на 46,4 проц.**

На адным з агульных сходаў рабочых кіраўнікі паставілі пытаньне аб скарыстаньні адкідаў вытворчасьці. На сходзе была прынята пастанова, якая па сутнасьці нікога і ні да чога не абавязвала. У пастанове было запісана: «Увязаць праверку калдагавораў з максымальным скарыстаньнем адкідаў для вырабу прадметаў шырокага спажыву.

Пастанова «вообще» таксама была пакладзена пад сукно. Бюро партыйнага калектыву нічога не зрабіла для таго, каб арганізаваць **камуністаў, камсамольцаў, ударнікаў-актывістаў на выкананьне баявой задачы — уцілізацыю адкідаў вытворчасьці і выпусьціць больш тавараў шырокага спажыву і добрых па якасьці.**

Трыкутнік заводу ў асобе дырэктара **Фарберава,** сакратара парткалектыву **Дыванава** і старшыні заўкому займаліся тавараль-няй аб уцільцэху і практычна нічога не рабілі. Адкіды валяліся дзе папала і пераціраліся ў гніль.

Толькі пасьля таго, як рабочыя шаруча патрабавалі ад кіраўнікоў работы па скарыстаньні адыходаў, па заводзе пачынаюць «варушыцца». З большага ўкамплектавалі цэх рабочай сілай. На чале паставілі загадчыка **Гефтара.** Аднак, з самага пачатку ў повага загадчыка вытвілася ўстаноўка падарваць аўтарытэт прадпрыемства. Кавалкі гнілой аўчыны скарыстоўваюцца для вырабу шапак.

— Ганебна для нас,—гаварылі рабочыя загадчыку,—што мы выпускаем на рынак брак.

На гэта рабочыя атрымлівалі такі адказ: **«Тавар-жа пойдзе не гарадзкім рабочым, а лесарубам, якія ў асноўным зьяўляюцца вясковуцамі»...**

Да рэчы, такая ўстаноўка была і ў кіраўнікоў заводу. **Гефтар** гэтым самым выканаў волю апартуністычнага кіраўніцтва. Уцільцэхам было выпушчана **2.500** шапак, няпрыгодных для скарыстаньня, коштам у **5 р. 60 кап.** за штуку.

Апартуністы заводу былі чамусьці, перакананы ў тым, што і пікуды нявартая прадукцыя пойдзе ў ход. І, як гэта ня дзіўна, шапкі знайшлі пакупцоў... **Белкаапсаюз, Белгандаль (Гомель) заключылі дагавары з заводам на 480 шапак. Скурабітаньне (Мінск) заключыла дагавор на 120 шапак. Характэрна, што ні адна з арганізацый ня цікавілася якасьцю асартымэнту. Ня цікавіўся якасьцю і Скурсанабзбыт, які атрымаў ад заводу 1.027 шапак і накіраваў іх лесарабкопу.**

Белгандаль і Белкаапсаюз [illegible] дукцыю накіравалі ў сельспажыўтаварыствы і закрытыя рабочыя кааператывы з расцэнкай па **7 р. 80 кап. за шапку.** І да гэтага часу ўся прадукцыя ўцільцэху футравага заводу ляжыць у магазынах мёртвым капіталам.

Кіраўнікі ўказаных арганізацый ня лічыліся з патрабаваньнямі спажыўцоў рабочых, калгаснікаў і працоўных сялян—аднаасобнікаў. **Завін, Перкін, Хвайніцкі** імкнуліся даказаць, што за якасьць прадукцыі, якую выпускае завод, яны не павінны адказваць. Іх справа прыняць усё тое, што ім даюць.

Гора-кіраўнікам няма ніякай справы да таго, што брак скарыстоўваецца клясавым ворагам у яго барацьбе супроць разгортваньня таваразвароту і калгаснага гандлю.

Трыкутнік аўчына-футравага заводу, разам з Перкіным, Завіным, Хвайніцкім, імі кідаючы адносінам саслужыў справу клясаваму ворагу.

ЦКК КП(б)Б, РАСЬСЛЕДАВАЎШЫ ГЭТУ СПРАВУ, МОЦНА ЎДАРЫЛА ПА ТЫХ, ШТО СКАЖАЮЦЬ ДЫРЭКТЫВЫ ПАРТЫІ І ЎРАДУ. Аб фактах парушэньня дырэктыў кіраўніцтва заводу і інш. адказнымі працаўнікамі ў справе выпуску прадметаў шырокага спажываньня павінна ведаць уся пралетарская грамадзкасьць.

Партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі гаспадарнікі аўчына-футравага заводу неадкладна павінны выправіць дапушчаныя ў практычнай рабоце памылкі і мабілізаваць рабочых па выкананьне прамфінпляну, на выкананьне праграмы выпуску прадметаў шырокага спажываньня.

А. М...

Ч. В. А. адказнага рэдактара А. МІТЛ...

Франка-германскія спрэчкі аб „раззбраеньні"

П. Андроўскі

Першая сэсія міжнароднай канфэрэнцыі па раззбраеньні, якая засядала паўгода ў Жэнэве, выявіла, як памятаюць чытачы, цэлы рад супярэчнасьцяй паміж усімі імпэрыялістычнымі дзяржавамі. Кожная з гэтых дзяржаў высоўвала такія прапазыцыі «раззбраеньня», якія азначалі **раззбраеньне іншых і ўмацаваньне ваеннай перавагі данай дзяржавы.** Амэрыка прапанавала эўрапэйскім дзяржавам, асабліва сухаземным, скараціць свае арміі на адну трэцюю частку, а Англія прапанавала скараціць у такой-жа прапорцыі яе наяўныя морскія сілы, тады як самі ПАЗШ, паводле пляну Гувэра, павінны былі скараціць толькі сваю... суднабудаўнічую праграму. Францыя, якая ўладала самай магутнай у сьвеце сухаземнай арміяй, высунула заведама для ўсіх неажыцьцявімы плян стварэньня «міжнароднай арміі» пад апекай Лігі нацый. Высоўваючы гэты яўна фантастычны плян, Францыя прасьледавала толькі адну мэту: **перашкодзіць усякаму хаця-б малейшаму скарачэньню ўзбраеньняў,** бо цяперашняе становішча, якое забясьпечвае Францыі вялізарную ваенную перавагу над раззброенай Германіяй, вельмі выгодна для французскага імпэрыялізму.

Самай вострай з усіх супярэчнасьцяй, якія з усёй сілай выявіліся на Жэнэўскай канфэрэнцыі, зьяўляецца супярэчнасьць паміж Францыяй і Германіяй. Вэрсальскі дагавор вельмі абмежаваў правы Германіі па ўзбраеньне. Германія мае права трымаць армію (рэйхсвэр), лікам **ня больш 100 тыс. чалавек.** Апрача таго, згодна вэрсальскага дагавору, гэта армія можа быць набрана выключна з вольнанаймовых салдат, якія падпісваюць пры паступленьні ў армію кантракт на 12 год. Дзякуючы такому, падзвычай доўгаму тэрміну службы, Германія пастаўлена ў вельмі выгодныя ўмовы ў адносінах стварэньня ваенна-навучаных рэзэрваў, наколькі склад арміі можа абнаўляцца толькі праз кожныя 12 год.

Апрача гэтага, Германія зьвязана радам іншых абмежаваньняў. Яна ня мае права на стварэньне танкавых і іншых тэхнічных часьцей, ня мае права на цяжкую артылерыю, на ваенную авіацыю, ня можа мець бронепоездаў, абмежавана ў адносінах іншых ваенна-марскіх адзінак і г. д.

На Жэнэўскай канфэрэнцыі германскі ўрад высунуў патрабаваньне прадастаўленьня Германіі «роўнапраўя» узбраеньняў. Тэзіс германскага ўраду заключаецца ў наступным: «Вэрсальскі дагавор, які прадпісваў Германіі вельмі далёка ідучыя абмежаваньні ўзбраеньняў, меў на мэце, што гэта зьяўляецца толькі першым этапам да ўсеагульнага раззбраеньня, і што сьледам за Германіяй і іншыя дзяржавы адпаведна скарацяць свае ўзбраеньні. Таму Германія патрабуе адно з двух—або ўсе дзяржавы згадзяцца скараціць свае ўзбраеньні да ўзроўню германскіх, або Германіі трэба прадставіць права павялічыць свае ўзбраеньні на-роўні з іншымі дзяржавамі».

Калі ў пачатку мінулага году Германія выступіла з праектам стварэньня аўстра-германскага мытнага саюзу, германскі ўрад таксама быў зусім перакананы у посьпеху свайго выступленьня таму, што ён угрунтаваў юрыдычнымі дакумантамі «закопамернасьцю» гэтага мытнага саюзу і яго адпаведнасьцю з міжнародным дагаворам. Германскі ўрад павінен быў перакананца на горкім вопыце, што ў такога роду справах самая ўтэнчаная юрыдычная аргумэнтацыя нічога ня варта. У палітыцы вырашаюць не аргумэнты права, **а рэальныя суадносіны сіл.** Гэтыя рэальныя суадносіны сіл былі не ў карысьць Германіі, і спроба стварэньня мытнага саюзу, які аб'яднаў-бы Германію з Аўстрыяй у адно эканамічнае цэлае, пацярпела крах.

Паведамленьні з Парыжу, Лёндану і іншых сталіц сьведчаць аб тым, што і на гэты раз чарговая спроба ўраду фон-Папэна дабіцца перагляду вэрсальскага дагавору ў частцы ваеннай, асуджана на няўдачу. Наіўная лёгіка германскай буржуазіі, якая дабіваецца для Германіі становішча імпэрыялістычнай дзяржавы, «раўнапраўнай» з іншымі імпэрыялістычнымі дзяржавамі, зусім не пераканальна для апошніх. У тым-та і справа, што французкі імпэрыялізм зусім ня зьбіраецца адмовіцца ад тых вялізарных перавар, якія дае яму ваенная перавага над Германіяй.

Англія ня мела-бы нічога супроць дапамагчы Германіі некалькі павялічыць сваё значэньне ў якасьці ваенна-палітычнага фактару ў Эўропе. Гэта дало-бы магчымасьць Англіі зноў зьвярнуцца да тэй палітыкі балянсаваньня паміж Германіяй і Францыяй, якую яна на працягу многіх год з такім посьпехам практыкавала і **супроць Францыі і супроць Германіі.** Некаторае ўзмацненьне Германіі выгодна Англіі, паколькі яна дае ёй магчымасьць больш незалежных адносін да Францыі.

Аднак, сучасныя ўмовы і развіцьцё гаспадарчага крызісу ў Англіі прымушаюць апошнюю адмовіцца ад гэтай традыцыйнай палітыкі. Вялізарная фінансавая магутнасьць Францыі, якая зьяўляецца на даным этапе фактычным дыктатарам ў галіне між народных фінансаў, прымушае Англію ўнікаць стараннна ўсяго, што можа яе пасварыць з Францыяй. Вось чаму хутка пасьля таго, як французкі ўрад рэзка абверг германскія патрабаваньні аб роўнапраўі ўзбраеньняў, англійскі ўрад са свайго боку выступіў з мэмарандумам, які **поўнасьцю салідарызуецца з пазыцыяй французкага ўраду.** Падобна таму, як гэта мела месца ў пытаньні аб мытным саюзе і ў пытаньні аб рэпарацыях, германскі ўрад і на гэты раз апынуўся твар да твару з **адзіным англа-французскім блёкам.**

Якія пазыцыі іншых буйных дзяржаў у франка-германскіх спрэчках?

Злучаныя Штаты выказваюцца ў тым сэнсе, што франка-германскія спрэчкі іх мала цікавяць. Разам з тым ПАЗШ **зусім ня схільны падтрымліваць Германію.** Яно і зразумела. Ня гледзячы на ўсе фантастычныя чуткі аб эканамічным» ажыўленьні», якія распаўсюджваюцца агентамі Гувэра ў сувязі з надыходзячымі праз 1 з пал. месяцы прэзыдэнцкімі выбарамі, становішча амэрыканскіх фінансаў усё яшчэ застаецца пагражаючым. За апошнія дзесяць дзён біржавы індэкс Доў-Джонса **ўпаў на 15 пунктаў. Дэфіцыт дзяржаўнага бюджэту ў гэтым годзе перавысіць 3 млрд. даляраў.** У гэтых умовах амэрыканскі фінансавы капітал баязьліва аглядзецца да Парыж і ўпікае ўсякіх ускладненьняў з французкім імпэрыялізмам, здольным нанесьці адчувальныя ўдары даляру, які з вялікай труднасьцю захоўвае сваю роўнавагу.

Японія цалкам салідарызуецца з Францыяй. У гэтым няма нічога дзіўнага. Японскі друк зусім адкрыта заяўляе, што Японія можа быць у гэтым пытаньні толькі на баку Францыі, якая так беззагаворачка падтрымлівае імпэрыялістычную палітыку Японіі на Далёкім Усходзе.

Адзіная з больш або менш буйных дзяржаў, якая выказваецца спачувальна аб германскіх патрабаваньнях, **гэта—Італія.** Мусаліні нават апублікаваў у газэтах артыкул пад загалоўкам: «Германія мае рацыю», у якім даказвае неабходнасьць перагляду вэрсальскага дагавору і прадастаўленьня Германіі права ўзбройвацца. Гэта пазыцыя Італіі тлумачыцца палітычнасьцю супярэчнасьцяй паміж Італіяй і Францыяй і вынікаючай адсюль зацікаўленасьцю Італіі у ваенным узмацненьні Германіі, якое нямішуча мела-бы вынікам аслабленьне міжнароднага становішча Францыі. Між іншым, нават германскі друк ня вельмі высока цэніць італьянскае падтрыманьне. Навучаныя мінулым вопытам германскія газэты адзначаюць, што спачуваньне Італіі посіць, галоўным чынам, **платанічны характар.** Італія такім чынам шантажыруе Францыю, але калі справа даходзіць да рашучай фазы, Італія ў канчатковым выніку ўстрымліваецца ад рэалізацыі супраціўленьня французкай палітыцы.

Такім чынам, тая міжнародная абстаноўка, пры якой урад фон-Папэна выступіў з патрабаваньнем перагляду ваенных артыкулаў вэрсальскага дагавору, вельмі нясприяючая для Германіі. Тым ня менш урад фон-Папэна—фон-Шлейфэр вымушан настойваць на гэтых сваіх патрабаваньнях, ня гледзячы на іх яўны провал. Да гэтага германскі ўрад вымушан у асноўным меркаваньнямі ўнутранай палітыкі. Вялізарнае абвастрэньне ўнутраных супярэчнасьцяй Германіі, «свяласаблівае» становішча «канцыцуйскага» ўраду фон-Папэна, які самым грубым чынам парушыў Вэймарскую канстытуцыю, і які застаецца на чале ўлады пасьля таго, як рэйхстаг амаль аднагалосна выказаў яму недавер'е, вымушае ўрад фон-Папэна хапацца за ўсё, што можа аказаць яму некаторую папулярнасьць і пашырыць яго надзвычай вузкую сацыяльную базу.

Скарачаючы ў парадку сьледуючых адзін за другім надзвычайных дэкратаў заработную плату працоўных, дапамогу беспрацоўным, праводзячы бязьлітаснае наступленьне на жыцьцёвы ўзровень рабочай клясы,—урад магнатаў цяжкай прамысловасьці і ўсходня-прускіх вамешчыкаў стараецца адыграцца перад масамі на пытаньнях зьнешняй палітыкі, стараецца паказаць з сябе бястрашнага барацьбіта з вэрсальскай сыстэмай і за «вялікую Германію».

Так супярэчнасьці ўнутрыпалітычныя пераплятаюцца з міжнароднымі супярэчнасьцямі імпэрыялізму і садзейнічаюць іх далейшаму паглыбленьню і абвастрэньню. На вопыце ўсіх гэтых няўдалых ватуг германскай буржуазіі паказаць пешта накшталт барацьбы з Вэрсалем, найшырэйшыя працоўныя масы Германіі лішні раз пераконваюцца ў **поўнай няздольнасьці германскай буржуазіі змагацца за вызваленьне з-пад вэрсальскага ярма, і ў тым, што толькі пераможная пралетарская рэвалюцыя вырашыць гэту задачу, і гэта зьвяжэньне вэрсальскага ярма можа адбыцца толькі адначасова са зьвяржэньнем капіталістычнага ярма ў Германіі.**

ПАСЬПЯШАЙСЯ КУПІЦЬ БІЛЕТ

3-й аўта-мота-вэлё-лётарэі Аўтадору

ТЫРАЖ

білетаў 19-га разраду 3-й аўта-мота-вэлё-лётарэі Аўтадору адбудзецца 29—30 верасьня 1932 г. у гор. МЕНСКУ.

У 19-м РАЗРАДЗЕ РАЗЫГРЫВАЕЦЦА:
6 аўтамабіляў „ФОРД" А ці АА ці трактараў;
7 мотацыклаў ці піяніно;
10 аўтападарожжаў ці лампавых радыёпрыёмнікаў;
100 вэлёсыпэдаў
і яшчэ каля 1.600 каштоўных выйгрышаў (касьцюмы, спартыўны інвэнтар, палюўнічыя стрэльбы і інш).

Усе білеты 19-га разраду распаўсюджаны выключна па БССР.

Продаж застаўшыхся лётарэйных білетаў у Райсветах і ячэйках Аўтадору ці ў Цэнтральным Савеце Таварыства (Менск, Савецкая, 82).

Узмацняючы Аўтадор, дапамагаючы матарызацыі Чырвонай арміі.

„Чырвоная Зорка". Пач.: 6, 7-30, 9, 10-30. Каса—ад 1 г. дня. Мастацкі фільм МАЦІ. Звыш праграмы кіно-хроніка САЮЗКІНО.

„Інтэрнацыянал". Пач.: 6 г., 7-30, 9, 10-30. Дзённы сэанс у 2 гадзіны. Лепшы савецкі фільм КАІН і АРЦЕМ. Звыш праграмы кіно-хроніка Саюзкіно.

„Пралетары". Замежная камэдыя РАДЫЁ І ЛЕЎ. Звыш праграмы хроніка Саюзкіно Наш Горкі. Дзённы дзіцячы сэанс. Хроніка Саюзкіно Наш Горкі.

„СПАРТАК". Пач.: у 7, 8-15, 9-30, 11. Каса—з 5 г. Мастацкі фільм АЛІМ (Крымскі джыгіт) драма ў 7 частках.

СКОРА! БАРБАРА ЛЯ-... Конвей Цірль. У лепшая замежная фільма МАНОН (БЕЛАЯ МОЛЬ).

Мясьціслаўскі вучотна-фінансавы тэхнікум Калгасцэнтру БССР працягвае прыём заяў на 1-шы курс тэхнікуму.

Тэхнікум рыхтуе спэцыялістаў для галіны зьвяна калгассыстэмы ў галіне: вучоту, плянаваньня, фінанс. і крэдыту. Тэрмін навучаньня 3 гады. Студэнты забясьпечваюцца інтэрнатам і стыпэндыяй па нормах ураду. Узрост паступаючых ад 17 да 35 год. Асобы, якія скончылі 7 годкі, ШКМ, ФЗС, курсы па падрыхтоўцы ў тэхнікум, а таксама тыя, што скончылі 6 груп гэтых школ, але маюць стаж фін.-вучотн. працы ня менш 6 месяцаў, прымаюцца без іспытаў. Усе іншыя падлягаюць іспытам у аб'ёме 7-годкі.

Да заяў аб паступленьні падаць наступныя дакумэнты (у арыгіналах): аб узросьце, аб адукацыі, аб сацпаходжаньні і матар'яльн. становішчы па, ступаючага і яго бацьку, вучотна-вайсковы білет (для мужчыны), анкету, заасьведчаную сав., парт., праф. або інш. арганізацыі аб стане здароўя, 2 фотакарткі.

Заявы і дакумэнты з долучэньнем на 30 кап. пошт. марак (не пазьней 30 верасьня) накіраваць па адрасе: г. Мясьціслаў, Савецкая 11-9, вучотна-фін. тэхнік. му.

Да атрыманьня паведамленьня ад тэхнікуму аб залічэньні і пачатку заняткаў на вучобу не выязджаць.

Дырэктар тэхнікуму Жыгуноў.

Беларускі тарфяны вучэбны камбінат паведамляе ўсіх студэнтаў, што заняткі пачнуцца:

па інстытуту на III і IV курсах усіх спэцыяльнасьцяй 10 кастрычніка г. г. у 8 г. раніцы, па тэхнікуму на II (за выключэньнем II і мэханікі, былых тэхнікаў-заў) III курсах усіх спэцыяльнасьцяй 1 кастрычніка г. г. у 8 гадзін раніцы.

Аб пачатку заняткаў на ўсіх астатніх курсах будзе паведамлена асобна (асабіста і праз друк).

Прыяжджаючым студэнтам узяць з сабой пасьцельныя прылады.

Калектыў ЛКСМБ рэдакцый цэнтральных газэт БССР з глыбокім жалем паведамляе аб нечаканай сьмерці лепшага камсамоль